ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 42 (1057) | Субота, 15 кастрычніка 1955 года | Цана 40 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

П. Глебка. — Непарушная дружба (1 стар.).
Я. Цікоцкі. — Натхнёнае мастацтва. (1 стар.).
А. Адамовіч. — Вывучаць літаратурную спадчыну (2 і 3 стар.).
В. Піменаў. — Аснова п'ссы — чалавек і яго характар (2 стар.).
А. Гантман. — Наша агульная справа (2 стар.).
І. Бас. — Малады Міцкевіч і яго асяроддзе (3 стар.).
Я. Данская. — Інспектар прыехаў (4 стар.).
Н. Арлоў. — Маладыя кампазітары (4 стар.).

НЕПАРУШНАЯ ДРУЖБА

Нядаўна, у час месячніка польска-совецкай дружбы, у адным з тэатраў Палаца культуры і навукі паказваў свае спектаклі Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Купалы. Адначасова ў сталіцы Польскай Народнай Рэспублікі выступалі салісты Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балету і беларускія пісьменнікі. Сустрэчы польскіх працоўных з прадстаўнікамі беларускага мастацтва і літаратуры выліліся ў яркую дэманстрацыю гарачай і шчырай дружбы паміж народамі Польшчы і Совецкага Саюза. У сувязі з гэтым прыемна ўспомніць, што дружба паміж працоўнымі людзьмі нашых краін мае сваю даўнюю гісторыю і вытрымала многія выпрабаванні.

Польскі народ і тры найбольш шматлікія народы Совецкага Саюза — рускіх, украінцы і беларусы — з'яўляюцца суседзямі і ўваходзяць у адну сям'ю славянскіх народаў. Яшчэ ў далёкія мінулыя часы яны часта аб'ядноўваліся для таго, каб агульнымі сіламі даць належны адпор сваім ворагам, калі тыя квапіліся іх заняволіць.

Аднак на працягу многіх стагоддзяў паміж працоўнымі Польшчы і нашай краіны, якія заўсёды з адкрытым сэрцам імкнуліся жыць у дружбе, часта станавіліся варожыя сілы — феадалы і капіталісты абодвух краін. Яны імкнуліся ў сваіх вузкакарыслівых класавых мэтах пасварыць нашы народы і нацкаваць іх адзін на аднаго. Асабліва напружанымі сталі адносіны паміж Польшчай і нашай краінай пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, калі польскія памешчыкі і капіталісты страцілі на ўсходніх землях Украіны і Беларусі свае маёнткі і заводы. Нянавісць да краіны социялізма штурхала рэакцыйныя польскія ўрады ў абдымкі самых заядлых антысовецкіх авантурыстаў аж да гітлераўцаў уключна.

Ці мог польскі рабочы клас і польскае працоўнае сялянства спачуваць такой палітыцы і падтрымліваць яе? Безумоўна, не. Польскі народ добра разумеў, што толькі апіраючыся на Совецкі Саюз, ён захавае сваю нацыянальную незалежнасць і даб'ецца сваіх социяльных правоў. І ён насіў у сваім сэрцы запаветную мару аб самай блізкай, аб самай шчырай, аб самай вернай дружбе з народамі Совецкага Саюза. А мару гэтую саграваді многія прыклады з мінулых добрасуседскіх адносін і брацкага еднання перадавых людзей польскага і рускага народаў.

Зварушлівы малюнак такога еднання намаляваў А. Міцкевіч, расказаўшы ва ўступе да трэцяй часткі «Дзядаў», як аднойчы ўгечары ў Пецербургу, узяўшыся за рукі, укрыўшыся адным плашчом ад дажджу, стаялі два юнакі. Адзін з іх быў вандроўнік з Захаду, ахвяра царскага самаўладства А. Міцкевіч, а другі — паэт рускага народа, «славуты песнямі на ўсёй Поўначы» А. Пушкін. Яны стаялі перад помнікам Пятру І і думалі аб тых часах, калі засвеціць сонца свабоды і згіне тыранія.

А. Пушкін у вершы, прысвечаным А. Міцкевічу, успамінаючы пра вялікага польскага паэта і яго прабыванне ў Расіі, заазначыў:

Он между нами жил
Средь племени ему чужого, злобы
В душе своей к нам не питал, и мы
Его любили. Мирный, благосклонный,
Он посещал беседы наши. С ним
Делились мы и чистыми мечтами,
И песнями...

І далей:

... Он говорил о временах грядущих,
Когда народы, распри позабыв,
В великую семью соединятся.

Сведчанне А. Пушкіна аб сардэчных пачуццях польскага паэта да рускага народа ёсць праўдзівае сведчанне аб гэтых-жа пачуццях шырокіх народных мас Польшчы, таму што А. Міцкевіч быў голасам свайго народа.

З вялікай любасцю ставіўся А. Міцкевіч да рускага народа ў сваіх лекцыях па славянскіх літаратурах. Ён шчыра сябраваў з дзекабрыстамі і з многімі рускімі паэтамі. Ён цёпла маляваў прадстаўнікоў рускага народа ў сваіх творах. Такім, напрыклад, намалёван вобраз чэснага і чалавечнага капітана Рыкава ў паэме «Пан Тадэуш».

З глыбокім братэрскім пачуццём сардэчнасці ставіўся А. Міцкевіч і да літоўскага, і да украінскага, і да беларускага народаў. З беларускім народам А. Міцкевіч быў звязаны асабліва цесна. Ён вывучаў яго жыццё і побыт, захапляўся беларускай прыродай, любіў і выкарыстоўваў беларускія народныя легенды і песні. Надзвычай высокую ацэнку ў лекцыях па славянскіх літаратурах А. Міцкевіч даў беларускай мове, назваўшы яе «самай багатай і чыстай гаворкай», поўнай «узвышанай прастаты». Беларускі народ любіў і любіць блізкую яму творчасць А. Міцкевіча. Нядарам у некаторых варыянтах безымяннай беларускай паэмы першай паловы XIX стагоддзя «Тарас на Парнасе» імя вялікага польскага паэта стаіць поруч з імёнамі любімых беларускім народам рускіх пісьменнікаў А. Пушкіна, М. Лермантава, Н. Гогаля. Аб шырокай папулярнасці твораў А. Міцкевіча сярод беларускіх чытачоў сведчыць і той факт, што ўжо ў сярэдзіне мінулага стагоддзя В. Дунін-Марцінкевіч зрабіў першую спробу перакласці паэму «Пан Тадэуш» на беларускую мову.

Высока цанілі вялікага нацыянальнага паэта польскага народа рускія дзекабрысты і літаратары таго часу. З брацкім спачуваннем ставіліся яны і да барацьбы польскага народа за яго незалежнасць. Асабліва горача падтрымлівалі гэту барацьбу рускія рэволюцыйныя дэмакраты. А. Герцэн гаварыў: «Мы з Польшчай, таму што мы за Расію. Мы на баку палякаў, таму што мы рускія. Мы хочам незалежнасці Польшчы, таму што мы хочам свабоды Расіі. Мы з палякамі, таму што адзін ланцуг скоўвае нас абодвух».

Барацьбу польскага народа ў паўстанні 1863 года падтрымлівалі многія афіцэры рускай арміі. У гэтай барацьбе разам ішлі перадавыя людзі Польшчы, Беларусі і Літвы. І нашым абодвум народам дорагі імёны выдатных паплечнікаў таго часу — Яраслава Дамброўскага і Кастуся Каліноўскага, Зігмунда Серакоўскага і Валерыя Врублеўскага, якія праславілі сябе ў барацьбе супраць царскай тыраніі.

Мы не можам не прыгадаць сёння і дружбы многіх вядомых дзеячоў культуры польскага і беларускага народаў. Выдатны беларускі першадрукар і асветнік доктар Георгій Скарына вучыўся ў Кракаўскай акадэміі. У Кракаве-ж і Познані былі надрукаваны першыя кнігі беларускага паэта-дэмакрата Ф. Багушэвіча. Ф. Багушэвіч, цкаваны мясцовымі і польскімі панамі за яго беларускую, «мужыцкую», як яны называлі, творчасць, знаходзіў гарачую падтрымку з боку прагрэсіўнай польскай пісьменніцы Элізы Ажэшкі, якая гаварыла, што творы нашага паэта «маюць нейкае асаблівае хараство», і называла Ф. Багушэвіча «прыгожым талентам».

Такую-ж абарону ад нападак рэакцыйнага панства атрымаў у польскім друку і В. Дунін-Марцінкевіч у асобе свайго земляка, выдатнага польскага паэта Людвіга Кандратовіча. В. Дунін-Марцінкевіч быў у цеснай дружбе таксама з геніяльным польскім кампазітарам Станіславам Манюшкам, і іх брацкае сяброўства знайшло свой адбітак у творчым супрацоўніцтве, у выніку якога С. Манюшка напісаў па лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча оперу «Сялянка», пастаўленую ўпершыню ў Мінску.

Прыкладаў брацкага супрацоўніцтва паміж польскім народам і народамі нашай краіны, у тым ліку і беларускім народам, можна прывесці многа. Усе яны гавораць аб тым, што напоперак жаданням пануючых класаў раздзяліць нашы народы, пасеяць паміж імі варожасць, працоўныя масы нашых краін заўсёды былі звязаны цеснымі повязямі агульных інтарэсаў і вязменна імкнуліся жыць у дружбе і згодзе. З новай сілай гэта праявілася, калі на гістарычную арэну выступіў рабочы клас, на чале якога стала ленінская партыя. Ужо ў першай буржуазна-дэмакратычнай рускай рэволюцыі 1905—1907 г.г. рабочыя клас Расіі і Польшчы выступіў адзіным фронтам. На забастоўкі ў рускіх гарадах забастоўкамі салідарнасці адклікаліся рабочыя Лодзі і Варшавы, Чэнстахова і Беластока. Мы не можам забыць таксама, што пасля паражэння першай рускай рэволюцыі многія рускія рэволюцыянеры, вымушаныя эмігрыраваць за граніцу, знайшлі брацкі прытулак на польскай зямлі. На гэтай зямлі, сярод польскіх сяброў, пэўны час жыў і працаваў вялікі правадыр працоўных усяго свету, геній рускага народа В. І. Ленін.

Верныя гістарычнаму лозунгу — за вашу і нашу незалежнасць, дзесяткі тысяч палякаў прымалі ўдзел і ў Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Імя рыцара рэволюцыі, сына польскага народа Фелікса Дзержынскага, імёны Юльяна Мархлеўскага, Браніслава Весалоўскага, Кароля Свярчэўскага і многіх іншых назаўсёды застануцца ў гісторыі рэволюцыйнай барацьбы за вялікую справу працоўных Расіі і ўсяго свету.

У выніку перамогі Кастрычніка ў нашай краіне была створана першая ў свеце социялістычная дзяржава рабочых і сялян, якая абвясціла палітыку міру і дружбы, роўнасці і суверэннасці усіх народаў Расіі. Дэкрэтам Совецкага ўрада ад 29 жніўня 1918 года былі скасаваны і дагаворы царскага ўрада аб падзелах Польшчы. Гэта быў першы акт, які лёг у аснову сучаснай польска-совецкай дружбы.

З вялікай удзячнасцю паставіўся да гэтага акту совецкай улады польскі рабочы і селянін. Яны разумелі, што цяпер традыцыйная дружба з народамі Расіі павінна яшчэ больш расці, бо толькі на гэтым шляху польскі народ будзе мець сапраўдную незалежнасць і нацыянальную свабоду і даб'ецца социяльнага вызвалення.

І калі легіёны Пілсудскага рушылі на маладую совецкую рэспубліку, сотні тысяч польскіх рабочых выступілі супраць ганебнай захопніцкай палітыкі сваіх капіталістаў і памешчыкаў. Беларускі народ высока шануе памяць Станіслава Берсана, Конрада Шчэпанскага, Рамана Яблонскага і многіх іншых сыноў польскага народа, якія мужна загінулі пры абароне Мінска ад белапольскіх захопнікаў.

Кроў, пралітая сынамі польскага і совецкага народаў у змаганні з царызмам і замежнай інтэрвенцыяй, кроў, пралітая імі ў барацьбе з гітлераўскімі захопнікамі, за незалежнасць і свабоду нашых народаў, звязала нас навекі з нашымі польскімі братамі. Мы, беларусы, з удзячнасцю ўспамінаем, што першыя польскія вайсковыя часці, уступіўшыя ў бой пад Леніна, разам з совецкімі войскамі першымі ступілі на нашу беларускую зямлю, несучы ёй вызваленне ад фашысцкай няволі. Мы з гонарам гаворым, што сыны Беларусі ў доблесных радах Совецкай Арміі і ў партызанскіх атрадах поруч з польскімі салдатамі і партызанамі змагаліся за вызваленне Польшчы.

Справа вызвалення Польшчы была кроўнай справай усіх народаў Совецкага Саюза. І сягоння мы з захапленнем аглядаем дасягненні польскага народа, здабытыя ім на свабоднай польскай зямлі, у брацкім супрацоўніцтве і пры сяброўскім удзеле нашага совецкага народа.

Адносіны брацкай дружбы і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры, устаноўленыя паміж нашымі дзяржавамі, — прыклад новых, невядомых у гісторыі адносін свабодных народаў, якія маюць агульную мэту і ідуць адным шляхам да супольнага шчасця і працвітання.

Вось чаму дасягненні польскага народа радуюць нас.

Нашы польскія сябры, як і мы, рады дзяліцца сваімі дасягненнямі. На гэтым грунце дружбы ўстанавіўся паміж нашымі народамі шырокі абмен матэрыяльнымі і культурнымі каштоўнасцямі. Тое, аб чым марылі нашы і польскія выдатныя культурныя дзеячы, стала явай. У нас бывалі дэлегацыі польскіх рабочых, сялян, работнікаў культуры і мастацтва. І наадварот, дэлегацыі народаў Совецкага Саюза сталі частымі гасцямі ў Польшчы.

Няма магчымасці не толькі назваць усе факты, але нават пералічыць рознастайныя формы брацкай узаемасувязі польскага і совецкага народаў. Я прыгадаю толькі некаторыя моманты з культурнага супрацоўніцтва польскага і беларускага народаў.

Сталы абмен наладзіўся паміж нашымі літаратурамі. У Мінску ў апошні час выдадзены на беларускай мове кніга Г. Сенкевіча, многія вершы сучасных польскіх паэтаў, друкуецца аднатомнік А. Міцкевіча. У Польшчы, у сваю чаргу, выдаюцца творы Я. Купалы, Я. Коласа і іншых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. У нашых перыядычных выданнях супрацоўнічаюць польскія пісьменнікі і журналісты. І, наадварот, нашы літаратары часта выступаюць на старонках польскай перыодыкі.

Наладжана брацкая творчая сувязь паміж вучонымі Беларускай Акадэміі навук і польскіх навукова-даследчых інстытутаў. Летам гэтага года мінскія навуковыя супрацоўнікі чыталі ў Польшчы курс лекцый па беларускай літаратуры і мове. У Беларускім дзяржаўным універсітэце навучаюцца дзеці польскіх рабочых і сялян.

Асабліва шырокія сувязі ўстанавіліся паміж работнікамі польскага і беларускага мастацтва. Мінчане з захапленнем слухалі ў Мінску выступленні польскага ансамбля «Мазоўшэ», глядзелі выстаўку польскага мастацтва, польскія фільмы. Зараз вялікім поспехам карыстаецца ў Мінску выстаўка дасягненняў Польскай Народнай Рэспублікі і выступленні ансамбля песні і танца «Шлёнск».

У нашага народа ёсць прыказка: «Калі ты мой друг, аддам за цябе і дух». Мы бачым, што гэта знаходзіць праяўленне і ў нашай дружбе з польскім народам—мы па-сяброўску шчодра абменьваемся не толькі матэрыяльнымі каштоўнасцямі, але і духоўнымі, каштоўнасцямі нашых душ і сэрцаў. І мы ўпэўнены, што польскія браты чуюць нашы сэрцы, напоўненыя бязмежнай любоўю да польскага народа, ведаюць нашы думы, якія так добра выказаў у эпілогу да паэмы «Рыбакова хата» народны паэт Я. Колас:

Мае браты, мае суседзі,
Свабодны, новы польскі люд!
Няхай-жа песняй звонкай медзі
Красуе наша дружба тут!
Няхай-жа стане тленню, прахам
Жыцця мінулага ярмо!
Мы пойдзем далей новым шляхам,
Друг другу руку падамо!

Пятро ГЛЕБКА,
член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР.

Натхнёнае мастацтва

Я. ЦІКОЦКІ,
кампазітар, народны артыст СССР

«Дзівосная зямля— гэтая Сілезія і дзівосныя людзі там жывуць. З аднаго боку ўсё такое чыста польскае — і ў архаічнай форме невялікіх драўляных касцёлаў, і ў старапольскай мове, у легендах і паданнях, у песнях і танцах, у народным мастацтве; усё авеяна ўспамінамі аб мінулых вяках. А з другога боку — магутны працоўны рытм людзей і машын, гіганцкі прамысловы кругаварот, кіпучая напружанасць людскіх намаганняў, галавакружны, ліхаманкавы тэмп жыцця, дым, пашчы домнаў, палыхаючая панарама, разораная да самых глыбінь зямля... А побач — зноў мілыя бескідскія ўзгоркі і нізіны, лясныя ўрочышчы, сакавітая зелень лугоў і змрочная глыбіня вялізных лясоў, і прасторы, напоеныя сонцам, хлебам і ліпавым цветам — ва ўсім гэтым — душа сілезкай зямлі і душа яе чалавека».

Так натхнёна і з вялікай любоўю да сваёй краіны піша вядомы сілезскі пісьменнік Густаў Марцынек. І ўсю глыбіню і сапраўднасць гэтых слоў паэта асэнсоўваеш, калі слухаеш і бачыш выступленні Польскага дзяржаўнага ансамбля песні і танца «Шлёнск», канцэрты якога зараз праходзяць у Мінску ў памяшканні Акруговага Дома афіцэраў. Як рознастайныя і шматгранныя прырода, побыт і людзі аднаго з цікавейшых куткоў сучаснай Польскай Народнай Рэспублікі— Поўночнай Сілезіі, гэтак-жа рознастайна і шматгранна яе цудоўнае мастацтва.

Маладосць, хараство, натхнёная таленавітасць, народнасць, надзвычайная жыццёвасць і жыццерадаснасць, невычарпальная весялосць і разам з тым глыбокалірычная шчырасць, сардэчнасць, цеплыня, пранікліваcць — вось асноўныя рысы мастацкага стылю выканання ансамбля «Шлёнск». Ансамбль яшчэ зусім малады, ён існуе ўсяго два гады, але ў яго рэпертуары багата твораў, розных па зместу, па характару і настрою, па дынамічнасці. У той-жа час усе гэтыя творы і іх выкананне аб'ядноўваюцца агульным паняццем жыццёвай праўды і народнасці.

У першым аддзяленні ансамбль выступае ў сялянскіх касцюмах Верхняй Сілезіі; у танцах мы бачым характэрныя касцюмы паасобных раёнаў Сілезіі: Ішчынскага — у сілезскім жартоўным вельмі тэмпераментным танцы «Метлаш» і Цешынскага — у «Танцы з хустачкамі», які некалькі пераклікаецца з вядомай беларускай «Мяцеліцай». Шахцёрскія песні «Над шахтай» і «Спрэчка» (вясёлая жартоўная харавая сцэна — спрэчка паміж шахцёрамі і металургамі) юнакі выконваюць у пышнай парадной форме гарнякоў Сілезіі. На працягу ўсяго другога аддзялення хор і танцавальная група апранутыя ў маляўнічыя касцюмы бескідскіх горцаў.

У праграме І-га аддзялення канцэрта хор выконвае цікавыя па мелодыцы, рознастайныя па рытму і настрою сілезскія песні, пранікліва гучыць шчырая мелодыя вядомай «Песні аб Вісле», якою пачынаецца канцэрт, за ёю следам ідуць песні «Трыста коней на двары», «Эй, мой Ясінек» (з цікавым чаргаваннем жаночага і мужчынскага хораў), «Каралінка» (салістка Уршуля Сівы). Асаблівы поспех выпадае на «Ураджайную» І. Дунаеўскага, якую хор выконвае на рускай мове з вялікім уздымам і ў добрым тэмпе, і на цікавыя сілезкія песні «Ішла дзяўчына ў лясок» і «Эй там у даліне» (з удзелам таленавітай салісткі хору Уршулі Парвол). Вялікае багацце гукавых адценняў паказвае хор а-капела ў рускай народнай песні «У цёмным лесе» (апрацоўка А. Свешнікава). Пранікліва гучаць у выкананні салістак Марыі Клос і Весі Бісто ў суправаджэнні хору дзве лірычныя песні «Вярба» і «Эй, дзікія гусі» (дзявочая думка). Вялікай мастацкай вартасцю з'яўляецца цудоўная сілезская народная песня «Карлічак», якая вылучаецца зменай рознастайных рытмаў і тэмпаў, жартаўлівай пераклічкай высокіх і нізкіх галасоў хору (сапрано адказваюць альтам, тэнары — басам і наадварот).

Нягледзячы на тое, што праграма другога аддзялення абмяжоўваецца песнямі і танцамі пэўных раёнаў Сілезіі (так званыя Бескіды), яна не менш рознастайная і цікавая, чым праграма першага аддзялення.

Песні «Ідуць горцы», «Піларэчка» і «Сонейка» вылучаюцца своеасаблівасцю ладава-гарманічнай асновы (так званыя народныя — пераменныя лады мелодыі) і багатымі падгалоскамі, элементамі народнай паліфоніі. Асаблівую цікавасць прадстаўляе героіка-эпічная песня «Ондрашэк» з яе падобнымі да аргана акордавымі гучаннямі і яркай інструментоўкай. Лірычныя асаблівасці поўднёва-сілезскай народнай песні добра адчуваюцца ў такіх песнях, як «Заходзіць сонейка» і «Хэлохэло» (напевы пастуха). У апошняй цудоўна чутны былі падобныя да рэха водгукі паасобных груп хору. З салістаў у другім аддзяленні трэба адзначыць Дануту Буры, Марылю Валецкую, Ганку Кондзера і, асабліва, — Юзэка Лідзецкага, які валодае характэрным па тэмбру голасам (бас-барытон) і абаяльнай артыстычнасцю. Дасціпную жартаўлівую песню «Дзед» саліст выканаў двойчы. Цікавымі з'яўляюцца паказаныя ў другім аддзяленні бескідскі горскі танец «Каламыйкі» і імклівы заключны танец «Пілкі» (танец дрывасекаў).

Сапраўднай душой калектыву, стваральнікам не толькі музычнай, але і ўсёй мастацкай часткі яго, з'яўляецца мастацкі кіраўнік ансамбля, сілезскі кампазітар і пісьменнік Станіслаў Хадына, вучань вядомага кампазітара, масцітага «Нестара польскай музыкі» — Ладаміра Ружыцкага. За кароткі час Ст. Хадына не толькі сабраў у адзіны мастацкі калектыў звыш 160 таленавітых сыноў і дачок польскага народа — былых шахцёраў, сталяраў, шафёраў, трактарыстаў і г. д., але і здолеў выхаваць з іх добрых спевакоў, музыкаў, танцораў і нават дырыжораў і хормайстраў. Усе песні і мелодыі танцаў апрацаваў або напісаў і потым з густам інструментаваў Ст. Хадына.

У справе стварэння і апрацоўкі танцаў вялікую дапамогу аказала калектыву балетмайстар ансамбля Эльвіра Камінска. Большасць танцаў пастаўлена на высокім мастацкім узроўні і з густам.

Поспеху канцэртаў спрыяе добрае гучанне аркестровай групы ансамбля, якая з'яўляецца амаль поўным складам сімфанічнага аркестра. Побач з асноўным кіраўніком хору і аркестра — Ст. Хадынай, добрыя здольнасці ў гэтай галіне паказваюць дырыжоры Эміль Гельмік і Рышард Перхала.

Канцэрты ансамбля Польскай Народнай Рэспублікі выклікаюць вялікую зацікаўленасць гледача сталіцы БССР і праходзяць з велізарным і заслужаным поспехам. Азнаямленне працоўных Мінска з цудоўнай народнай творчасцю Поўночнай Сілезіі, таксама як і гастролі майстроў мастацтва Беларусі ў Польшчы, з'яўляюцца сведчаннем непахіснай брацкай дружбы совецкага і польскага народаў.

Салісты І. Міхальскі, У. Парвол і М. Мацыолек выконваюць песню «Ішла дзяўчына».

Выстаўка „Дзесяць год Народнай Польшчы"

У Мінску, у Акруговым Доме афіцэраў, адкрылася выстаўка «Дзесяць год Народнай Польшчы», якая арганізавана Міністэрствам культуры і мастацтва сумесна з Цэнтральным упраўленнем выяўленчага мастацтва і выставак Польскай Народнай Рэспублікі.

На ўрачыстым адкрыцці выстаўкі прысутнічалі шматлікія прадстаўнікі грамадскасці Мінска і артысты польскага ансамбля песні і танца «Шлёнск», якія прыехалі на гастролі ў сталіцу нашай рэспублікі. З прамовамі выступілі намеснік Міністра культуры БССР П. Лютаровіч і першы сакратар Пасольства Польскай Народнай Рэспублікі ў СССР М. Хельман.

Шматлікія наведвальнікі з цікавасцю разглядаюць карціны і скульптуры польскіх дзеячоў мастацтва, фотаздымкі і іншыя экспанаты, якія знаёмяць совецкіх людзей з жыццём і працай польскага народа. Першы раздзел выстаўкі прысвечаны зараджэнню дэмакратычнага руху ў Польшчы, руска-польскім рэволюцыйным сувязям, барацьбе польскага народа за сваё вызваленне і брацкай дапамозе Совецкай Арміі ў вызваленні краіны ад фашысцкіх акупантаў.

Наступныя раздзелы выстаўкі яркa адлюстроўваюць пасляваеннае мірнае будаўніцтва ў краіне, аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі і культуры Польскай Народнай Рэспублікі. Шматлікія стэнды шырока знаёмяць гледача з поспехамі польскага народа. У лічбах, у фотамантажах і іншых экспанатах адлюстраваны велізарныя вынікі ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага жыцця рэспублікі.

Пераканальныя лічбы культурнага будаўніцтва Народнай Польшчы. Да 1938 года там налічвалася ўсяго 27 вышэйшых навучальных устаноў, у якіх навучалася 43.000 студэнтаў, з ліку якіх дзеці рабочых і сялян складалі ўсяго 6 працэнтаў. У 1954 годзе ў Народнай Польшчы была 81 вышэйшая навучальная ўстанова, дзе навучалася 147.000 студэнтаў. Дзеці рабочых і сялян складалі 66 працэнтаў.

Заслугоўваюць вялікай увагі і такія лічбы: дзесяць мільёнаў чалавек штогод прысутнічаюць на спектаклях тэатраў Польшчы. Дзевятнаццаць мільёнаў чалавек прысутнічаюць на спектаклях драматычных гурткоў самадзейнасці. Сто тысяч чалавек прымаюць удзел у 17.460 калектывах мастацкай самадзейнасці горада і вёскі, 152 мільёны чалавек штогод праглядаюць кінофільмы, сем мільёнаў чалавек штогод слухаюць оперы і канцэрты.

За небывала кароткі тэрмін Народная Польшча адновіла разбураную дашчэнту фашысцкімі захопнікамі сваю сталіцу Варшаву. Макет цэнтральнай часткі горада стварае ўяўленне аб велічным архітэктурным ансамблі, пасярод якога ўзвышаецца цудоўны Палац культуры.

Выстаўка знаёміць з гісторыяй рэволюцыйнай барацьбы рабочага класа Польшчы, з рэволюцыйнай дзейнасцю выдатных дзеячоў польскага народа.

Выстаўка з'яўляецца багатым дапаможнікам для азнаямлення з жыццём і поспехамі суседняга польскага народа.

Танцавальная група выконвае «Танец з хустачкамі» і танец «Метлаш».



Фото І. Салавейчыка.

Водгукі на пісьмо «За творчую дружбу ўсіх дзеячоў культуры»

Наша агульная справа

Зварот вядучых дзеячоў літаратуры і мастацтва, змешчаны ў газеце «Літаратура і мастацтва», глыбока ўсхваляваў наш калектыў. Пытанні, узнятыя ў гэтым пісьме, даўно з'яўляюцца прадметам гарачага абмеркавання сярод работнікаў Рускага драматычнага тэатра імя Горкага.

Мы глыбока пераконаны, што наладжванне творчай сувязі паміж працаўнікамі ўсіх галін мастацтва і літаратуры ўзніме якасць нашай працы на вышэйшую ступень.

Тое, што працаўнікі мастацтва Мінска жывуць да гэтага часу замкнёным жыццём, бяспрэчна адбіваецца на якасці і нашых спектакляў.

На жаль, наша тэатральная крытыка, як правіла, адарвана ад жыцця творчых калектываў, а тыя рацэнзіі, якія не ўлічваюць творчай асаблівасці калектываў, творчага почырку асобных акцёраў, не могуць быць аўтарытэтнымі для дзеячоў тэатра.

Пры адсутнасці кваліфікаванай крытыкі вялікую карысць прынесла-б узаемная творчая размова.

Да гэтага трэба дадаць, што з прычыны існуючай размежаванасці кожны працаўнік тэатра жыве толькі інтарэсамі свайго калектыву. Увесь яго рэжым дня складаецца з рэпетыцый і спектакляў, ён не ведае, што робіцца ў другіх калектывах, не гаворачы ўжо аб сумежных галінах мастацтва.

Мы абмеркавалі гэтыя пытанні і намецілі рад канкрэтных мерапрыемстваў.

У новым сезоне арганізуем у нашым тэатры лекторый. Намечана правядзенне не толькі лекцый, але і наладжванне сустрэч з рознымі дзеячамі навукі, культуры, вытворчасці.

Першая такая сустрэча ў нас адбылася з сакратаром Мінскага гаркома КПБ т. Варвашэнем, які расказаў аб выніках ліпеньскага Пленума ЦК КПСС.

У далейшым, апрача лекцый па марксізму-ленінізму, намечаны сустрэчы з работнікамі заводаў, калгаснікамі, дзеячамі медыцыны, фізікі, пісьменнікамі, архітэктарамі, кампазітарамі, мастакамі.

Апрача гэтага мы намячаем выезды ў калгасы і на заводы. Звычайна да гэтага часу нашы выезды былі парадным. Сустрэчы адбываліся так: уступнае слова аб тэатры, а затым канцэрт. Пасля гэтага работнікі тэатра ехалі дадому і ніякіх размоў з рабочымі не наладжвалі. Цяпер мы думаем прыняць удзел у вытворчых нарадах, больш грунтоўна пазнаёміцца, як жывуць рабочыя, як яны ажыццяўляюць рашэнні партыі і ўрада па ўмацаванню магутнасці нашай Радзімы.

Многія мерапрыемствы для ўсіх работнікаў мастацтва могуць і павінны праводзіць Упраўленне па справах мастацтва і Беларускае тэатральнае таварыства. Бядома, трэба ўсімі сіламі дамагацца адкрыцця Дома работнікаў мастацтва ў Мінску. Аднак адсутнасць яго ніяк не можа перашкодзіць правядзенню цікавых мерапрыемстваў.

Наш тэатр нядаўна быў на гастролях у Рызе і ў Таліне. У гэтых гарадах тэатральныя таварыствы працуюць вельмі добра. Мы дамовіліся з Эстонскім тэатральным таварыствам аб іх прыездзе ў Мінск для абмену вопытам работы.

Некаторыя мерапрыемствы могуць праводзіцца ў памяшканні нашага тэатра і тэатра імя Янкі Купалы, а таксама ў Доме афіцэраў ці ў любым кінотэатры. Для гэтага трэба толькі як належыць узяцца за справу, скласці план мерапрыемстваў і ажыццяўляць яго. Упраўленне па справах мастацтва зробіць правільна, калі гэтую работу ўскладзе на аднаго з інспектараў, якому трэба ўстанавіць кантакт з Тэатральным таварыствам і сумеснымі намаганнямі праводзіць работу.

Трэба ўскласці адказнасць за асобныя мерапрыемствы на калектывы тэатраў. Наш тэатр, напрыклад, мог-бы ўзяць на сябе правядзенне аднаго-двух мерапрыемстваў у месяц для ўсіх работнікаў мастацтва і літаратуры. Я глыбока пераконаны, што тое-ж самае з задавальненнем зробяць і іншыя калектывы.

Таксама трэба прадумаць арганізацыю адпачынку для работнікаў мастацтва і літаратуры ў выхадныя дні—правядзенне арганізаваных кіносеансаў, сумеснае наведванне канцэртаў, выставак і г. д.

Трэба шырэй прыцягваць на нашы сустрэчы прафесарскі склад Беларускага дзяржаўнага універсітэта, політэхнічнага інстытута. Работнікі мастацтва павінны ведаць, над чым працуюць беларускія вучоныя, што намячаецца ў новым пяцігадовым плане па развіццю прамысловасці і сельскай гаспадаркі рэспублікі.

Совецкі артыст, мастак, пісьменнік павінен валодаць вялікай культурай, мець шырокі кругагляд. Без гэтага ён не здолее ствараць яркія вобразы мастацтва і літаратуры.

Трэба, каб Міністэрства культуры БССР і Тэатральнае таварыства ўзначалілі вялікую справу нашага творчага еднання, а мы, работнікі тэатра, безумоўна, унясем сваю долю ў гэтую надзвычай важную для ўсіх нас работу.

А. ГАНТМАН.
дырэктар Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя Горкага.

Масква сёння. На вуліцы Чкалава.
Фото І. Кашэлькова і Б. Трэпетава.
(Фотахроніка ТАСС).

Насустрач XX з'езду КПСС

★

СПАБОРНІЦТВА РАБОТНІКАЎ КУЛЬТУРЫ

Сярод работнікаў культуры шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XX з'езду Комуністычнай партыі Совецкага Саюза. Для ўзнагароджання перадавікоў сацыялістычнага спаборніцтва Міністэрства культуры Саюза ССР устанавіла нагрудны значок «За выдатную работу».

Цяпер ва ўсіх установах і арганізацыях Міністэрства культуры БССР, у абласцях і раёнах разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар XX з'езду КПСС. Работнікі прадпрыемстваў Міністэрства культуры змагаюцца за павышэнне прадукцыйнасці працы і зніжэнне сабекошту прадукцыі, паляпшэнне яе якасці; супрацоўнікі ўстаноў — за арганізаванасць у працы ўсіх устаноў культуры рэспублікі, творчыя работнікі—за новыя дасягненні ў галіне мастацтва.

□

ПОСПЕХ ПРАДАЎЦОЎ КНІГ

Ва ўсенароднае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XX з'езду КПСС уключыліся работнікі прылаўка культмага Талачынскага райспажыўсаюза. Яны штодзень прадаюць палітычнай, мастацкай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры на паўтары-дзве тысячы рублёў. План мінулага месяца тут перавыкананы, прададзена розных кніг на сорак шэсць тысяч рублёў.

Загадчык культмага З. Франуза шырока выкарыстоўвае рознастайныя формы продажу літаратуры. Некалькі разоў прадаўцы магазіна выязджалі з кнігамі ў калгасы раёна.

С. ГАЦІЛА.

□

СТАЦЫЯНАРНЫЯ КІНОЎСТАНОЎКІ

У калгасах імя Сталіна, імя Варашылава, «Комінтэрн» і «Чырвоны баец» Магілёўскага раёна ўстаноўлены стацыянарныя кіноўстаноўкі. Цяпер у раёне працуе 11 гукавых, тры аўтакінаперасоўкі, а таксама 8 стацыянарных кіноўстановак.

Н. НАЗАРОВІЧ.

□

НОВЫЯ ХАТЫ-ЧЫТАЛЬНІ І БІБЛІЯТЭКІ

Пашыраецца сетка культурна-асветных устаноў у Гарадзішчанскім раёне. Нядаўна тут адкрыты дзве хаты-чытальні і адна сельская бібліятэка. Новыя ачагі культуры добра абсталяваны, маюць многа літаратуры.

Н. КОЛАЎ.

Рэспубліканскае журы конкурсу на лепшы кіносцэнарый

Міністэрства культуры БССР абмеркавала мерапрыемствы па правядзенню ў рэспубліцы першага тура Усесаюзнага конкурсу на лепшыя кіносцэнарыі мастацкіх фільмаў. Як вядома, конкурс праводзіцца Міністэрствам культуры СССР у азнаменаванне 40-годдзя Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі.

Для адбору і прадстаўлення сцэнарыяў на другі тур конкурсу зацверджана рэспубліканскае журы ў складзе: П. Броўкі (старшыня), К. Крапівы, М. Садковіча (намеснікі старшыні), Д. Бальшова, Е. Бондаравай, А. Бутакова, В. Вольскага, А. Гінцбурга, П. Глебкі, А. Голуба, К. Губарэвіча, В. Корш-Сабліна, І. Краўчанкі, А. Кучара, Л. Мазалеўскай, Ф. Новікавай, М. Фрайманa.

Для правядзення арганізацыйна-практычнай работы па першаму туру конкурсу Міністэрствам зацверджаны аргкамітэт у складзе Е. Бондаравай (старшыня), М. Блісцінава, К. Губарэвіча (намеснікі старшыні), А. Есакова і А. Красінскага. На аргкамітэт усклаўдзены абавязкі па прыёму і ўліку паступаючых на конкурс рукапісаў, арганізацыя іх рэцэнзіравання, пераклад на рускую мову сцэнарыяў, рэкамендаваных на другі тур конкурсу, а таксама кансультацыя аўтараў—удзельнікаў конкурсу.

Сцэнарыі на конкурс дасылаюцца на адрас Міністэрства культуры БССР.

Абмеркаванне музычных твораў

Кампазітары Беларусі рыхтуюцца да свайго другога з'езду. На мінулым тыдні ў Саюзе кампазітараў былі праслуханы новыя творы—фартэпіннае трыё М. Аладава, тры вакальныя творы на тэксты народных паэтаў Беларусі Я. Купалы і Я. Коласа — М. Чуркіна. Кампазітар А. Багатыроў пазнаёміў прысутных з двума вакальнымі цыкламі санат, напісаных на тэксты Шэкспіра. Маладыя кампазітары Г. Вагнер і Ю. Семяняка прадставілі свае новыя вакальныя і харавыя творы. Г. Вагнер напісаў баладу і дзве песні на словы А. Русака, Ю. Семяняка — раманс на тэкст А. Міцкевіча ў перакладзе на беларускую мову А. Бачылы.

Кампазітар І. Кузняцоў пазнаёміў прысутных са сваімі новымі песнямі, напісанымі ім пасля творчай камандзіроўкі на цалінныя землі.

Новыя музычныя творы атрымалі станоўчую ацэнку і ў бліжэйшы час будуць уключаны ў рэпертуар выканаўцаў эстрады, філармоніі і радыё.

М. ПІГУЛЕЎСКІ.

АСНОВА П'ЕСЫ—ЧАЛАВЕК І ЯГО ХАРАКТАР

Драматургія — летапіс сучаснасці. Але гэты летапіс—не бясстрасное занатаванне ўсяго таго, што існуе і нараджаецца, а дзейсная барацьба за фарміраванне валявога характару нашага сучасніка. Аднак часта мы адрозніваем нашы п'есы адну ад другой не па характарах людзей, якія маюць свае непаўторныя рысы 30-х—40-х—50-х гадоў, а па тым, аб чым гаворыцца ў п'есе. Вядома, ніхто не збіраецца адкідаць вялікага значэння фактычных прыкмет часу, тых прыкмет, якія вызначаюць пэўны гістарычны перыяд у жыцці народа. Але апрача іх ёсць яшчэ глыбокія ўнутраныя псіхалагічныя прыкметы, якія адрозніваюць характары людзей, змяняюцца ў залежнасці ад розных гістарычных эпох.

Вельмі часта бывае так: складаецца які-небудзь аўтарскі зборнік, узнімаецца пытанне аб новай пастаноўцы, аб перавыданні — і высвятляецца, што п'еса ўстаралa, што яна ўжо не гучыць, што многае ўжо адыйшло ў мінулае. Ці можна сабе ўявіць, каб калі-небудзь устарэлі, перасталі хваляваць лепшыя п'есы Остроўскага, Чэхава, Горкага, Хамзы, Шырван-Задэ, Янкі Купалы, Камала, лепшыя п'есы совецкіх драматургаў — «Любоў Яравая», «Чалавек з ружжом», «Нашэсце», «Хлапец з нашага горада», «Аптымістычная трагедыя», «Разлом», «Машанька» і многія іншыя? Ці можна ўявіць, што якое-небудзь выдавецтва адмовіцца перавыдаваць «Машаньку» Афінагенава, таму што п'еса гэтая не ўяўляе цікавасці, не адпавядае нашым сённяшнім запатрабаванням? Вядома, не. Справа ў тым, што ў гэтых п'есах ёсць не толькі надзённасць, не толькі актуальнасць, без чаго яны не сталі-б бліскучымі мастацкімі творамі, але і раскрыццё чалавечага характару. У нас жа ёсць многа п'ес, у цэнтры якіх не характар, а, скажам, вынаходніцтва новай машыны. А гэта машына з цягам часу змяняецца другой, робіцца старым якое-небудзь наватарскае вынаходніцтва, і п'есы, як мастацкага твора, няма, таму што ў ёй не было чалавека. Характар чалавека — аснова асноў драматычнага твора, у якім-бы жанры ён ні быў напісаны: у жанры драмы, трагедыі, водзвіля, лірычнай ці сатырычнай камедыі. Недахопам некаторых сатырычных камедый, між іншым, было тое, што іх аўтары раскрывалі не характары, а асобныя факты.

Але, калі партыя гаворыць аб сатыры, яна мае на мэце сур'ёзнага памочніка ў справе комуністычнага выхавання мас, а не паказ розных чалавечых заганаў, брудных гісторый і цёмных злачынстваў. Дакладна нацэленая сатыра, якая б'е па вялікаму і буйнаму злу, у той-жа час ачышчае, прасвятляе чалавека. А ў нас усё яшчэ шмат камедый дробных, якія толькі высмейваюць прыватны факт, асобныя выпадкі. Сатырычныя камедыі трэба ствараць і яны будуць ствараццa, але празмернае захапленне толькі гэтым жанрам можа пашкодзіць драматургіі, бо адны толькі сатырычныя камедыі збяднілі-б уяўленне аб нашым грамадстве, аб нашых людзях. Эпоха, людзі вывучаюцца па мастацтву ў сукупнасці ўсіх яго жанраў, а галоўнае — па творах, якія сцвярджаюць прыгажосць нашага жыцця, цудоўны вобраз совецкага чалавека.

Таму захапленне аднымі толькі камедыямі, якое намецілася ў тэатры, — прыводзіць да аднастайнасці рэпертуару, да аднастайнага праяўлення акцёрскіх здольнасцей, да збяднення тэатральнага мастацтва.

Трэба смялей шукаць тэмы, сюжэты і характары для сваіх твораў — арыгінальныя, самабытныя, якіх не было ў іншых, раней напісаных п'есах.

Ужо шмат гаварылася аб касяках п'ес, аб эпігонстве, аб паўторах, штампах, банальнасці, боязні новых шляхоў. Аднак гэтыя пытанні неабходна ставіць зноў, бо становішча не настолькі палепшылася, каб аб гэтым не гаварыць. Асабліва гэта відаць у камедыях, якія ўпарта развіваюць адны і тыя-ж матывы: нежаданне ехаць на перыферыю, няправільнае выхаванне моладзі ці зазнайства розных кіруючых таварышаў. Ці важна высмеяць усё гэта? Важна. Але калі з п'есы ў п'есу вандруюць адны і тыя-ж людзі, дык яны ўжо становяцца не смешнымі, а проста надакучлівымі. А п'есы з такімі «героямі» не што іншае, як эпігонства. Адкуль-жа ідзе гэтае эпігонства? Ад няўмення ўбачыць і вывучыць новае. Але і не толькі ад гэтага. Думаецца, што ў некаторых пісьменнікаў страчана адчуванне грамадскай значнасці літаратуры. Пісьменнік бярэцца за пяро не толькі для таго, каб напісаць «акт першы», а затым «акт другі» ці трэці, а для таго, каб як мага больш палымяна сказаць аб сваіх сучасніках, аб сваёй эпосе. Ён не павінен паўтараць сказанае, каб не быць толькі капіравальшчыкам, а адкрываць новыя гарызонты. Пісьменнік-грамадзянін заўсёды самастойны ў сваёй творчасці і не ідзе пратаптанымі сцежкамі.

Калі гаворыцца аб наследаванні горкаўскіх традыцый, традыцый Маякоўскага, дык справа тут не толькі ў высокім майстэрстве гэтых пісьменнікаў, але і ў тым, што яны былі трыбунамі часу, пісьменнікамі з вялікім грамадскім пафасам, які вызначаў наватарскую сутнасць іх творчасці.

Там, дзе няма характару чалавека, — там ілюстрацыя. П'еса ў такім выпадку пішацца па раней вызначанаму тэзісу, па заданню (старшыня калгаса павінен быць абавязкова аграном; юнак, які атрымоўвае ад бацькоў многа грошай, абавязкова сыдзе з правільнай дарогі і г. д.). Але ці можна дапусціць, каб пасля вялікіх заваёў драматургіі мы зноў звярталіся да дыдактычнай, маралізуючай п'есы, якая заўсёды ўзнікала там, дзе неставала майстэрства. Такія творы далёкія ад праўды жыцця, пабудаваны, як лагічныя шахматныя хады, з іх штучна выгнана ўсё, што перашкаджае разгортванню схемы.

Мы гаворым увесь час аб выхаваўчым значэнні драматургіі, аб яе месцы ў прапагандзе комуністычных ідэй. Але драматургія і тэатр не здолеюць выканаць гэтую сваю найвялікшую палітычную ролю, ролю настаўніка жыцця, калі будзе занядбаны чалавек і майстэрства раскрыцця яго характару.

Сюжэт, кампазіцыя, мова, характары, канфлікт — іменна яны выяўляюць ідэю, а не проста прывязваюцца да ідэі, як давескі. Вялы, ненапружаны, нецікавы сюжэт прыглушае тэму, не дазваляе п'есе дасягнуць выхаваўчай мэты. Мы ведаем, як захапляе востры сюжэт, якой папулярнасцю карыстаюцца творы з напружанай інтрыгай, выразным дзеяннем. Параўнаем, напрыклад, сілу ўздзеяння такіх кінотвораў, як «Подзвіг разведчыка» і «Выпрабаванне вернасці», такіх спектакляў, як «Платон Крэчэт» і «Светлае», «Глыбокая разведка» і «Народны акадэмік», «Маці сваіх дзяцей» і «Новыя часы». У першых ёсць востры, займальны сюжэт, у другіх ён вялы, раскіданы, невыразны і ідэйнае гучанне іх прыглушана.

Таму думаць, што востры сюжэт — прыналежнасць аднаго толькі дэтэктыва, было-б памылкай, якая вельмі шкодзіць нашай драматургіі.

Але сюжэт важны не сам па сабе, а пры ўмове, калі ён падмацаваны грамадзянскім пафасам пісьменніка. Перамога праўды, калі яна перададзена па-мастацку, праз лёс чалавека, заўсёды хвалюе сэрцы людзей. Вось чаму так жыва адгукнуліся на п'есу А. Штэйна «Персанальная справа» тэатры і гледачы, бо яна звернута да чалавечага сэрца і прасякнута грамадзянскім пафасам, без чаго немагчыма вялікае мастацтва.

Многа ўжо гаварылася ў нашым друку аб новым спектаклі В. Розава «У добры час!». Гэты спектакль, як і п'еса, вабяць сваёй шчырасцю, гумарам, праўдай аб моладзі і дарослых, якія выхоўваюць гэтую моладзь.

Многія тэатры паставілі новую п'есу Карнейчука «Крылле», якая смела ўтаргаецца ў жыццё.

Ва ўсіх гэтых п'есах ёсць недахопы: некаторая традыцыйнасць у пабудове сюжэта ў Штэйна, перагружанасць нераскрытымі пабочнымі сюжэтнымі лініямі ў Розава, адсутнасць арганічнай сувязі паміж паказам асабістага і грамадскага жыцця ў Карнейчука. Аднак гэтыя шчырыя і таленавітыя п'есы гавораць пра вялікія і сур'ёзныя магчымасці нашай драматургіі.

Другі з'езд совецкіх пісьменнікаў вызначыў далейшыя перспектывы развіцця совецкай драматургіі, якая павінна ісці простым і адзіна правільным шляхам вялікай жыццёвай праўды. Вучыцца ў вялікіх пісьменнікаў мінулага, смела ўтаргацца ў жыццё, няспынна ўзнімаць сваё прафесіянальнае майстэрства, памятаючы, што на совецкую літаратуру, як на вялікага друга і настаўніка, глядзіць увесь свет — высокародная задача совецкіх драматургаў.

В. ПІМЕНАЎ,
намеснік старшыні камісіі па драматургіі Саюза пісьменнікаў СССР.

НА ТЭМЫ ДНЯ

Перад пачаткам кіносеанса

Надыходзіць вечар. Многія мінчане накіроўваюцца ў кінотэатры. Большасць з іх прыходзіць задоўга да пачатку сеансаў. Але, на жаль, вельмі часта гледачам у гэты час даводзіцца сумаваць. Кіраўнікі некаторых тэатраў лічаць, што досыць толькі паказаць фільм. А між тым ёсць магчымасці арганізаваць культурны адпачынак і да пачатку сеанса.

Значную выхаваўчую работу праводзіць кінотэатр «Перамога». Тут сістэматычна перад гледачамі выступаюць артысты Беларускай эстрады, духавы аркестр Беларускай Ваеннай Акругі. У бліжэйшы час мяркуецца наладзіць паказ мастацкай самадзейнасці горада. Кінотэатр адгукаецца на ўсе падзеі ў жыцці краіны і чула прыслухоўваецца да запатрабаванняў гледачоў. Ужо колькі год моцная дружба звязвае калектыў кінотэатра з рабочымі шарыкападшыпнікавага завода і мотавелазавода. Работнікі гэтых прадпрыемстваў — частыя госці ў «Перамозе». Улічваючы іх жаданні, дырэкцыя наладжвае перад пачаткам сеансаў цікавыя лекцыі, канцэрты, паказ навукова-папулярных і дакументальных фільмаў. Нядаўна наведвальнікі мелі магчымасць праслухаць цыкл гутарак аб фізкультуры і спорце. Пасля былі паказаны фільмы «Нашы чэмпіёны», «Совецкія гімнасты ў Рыме», «Чэмпіёны Еўропы» і іншыя. Добрае ўражанне засталося ад сустрэчы гледачоў з дэлегацыяй Венгерскай народнай рэспублікі. Цікава праходзіць час перад пачаткам сеансаў і ў кінотэатры «Дзіцячы». Для дзяцей у фае наладжваецца абмеркаванне любімых кніг, сустрэчы з выдатнымі людзьмі рэспублікі, канцэрты самадзейных гурткоў.

На жаль, не ўсе кіраўнікі кінотэатраў скарыстоўваюць станоўчы вопыт культурнага абслугоўвання наведвальнікаў.

Так, напрыклад, у «Цэнтральным» ёсць розныя выстаўкі, моцна грыміць радыёла, але гледачам сумна. Даўно надакучылі экспанаты гэтых выставак, ды і пласцінкі выконваюцца далёка не ў першы раз. Сапраўднай работы па арганізацыі культурнага адпачынку тут няма.

Абыякава ставяцца да гэтых важных спраў гарадскі аддзел і Мінскае абласное ўпраўленне культуры.

Арганізацыя цікавага, змястоўнага і культурнага адпачынку гледачоў — надзвычай сур'ёзная справа, якая патрабуе да сябе выключнай увагі.

А. АРТАБАЛЕЎСКІ,
В. СМАЛЬ.

Вывучаць літаратурную спадчыну

(Да выхаду Збора твораў К. Чорнага)

Завершана выданне шасцітомнага Збора твораў К. Чорнага. Упершыню, па сутнасці, наш чытач можа атрымаць уяўленне аб багатай і шматжанравай спадчыне выдатнага беларускага празаіка.

Раманы «Зямля», «Ідзі, ідзі», «Трыццаць год», аповесць «Лявон Бушмар», п'еса «Лета», шматлікія апавяданні і артыкулы пісьменніка атрымалі як-бы другое жыццё. Некаторыя з гэтых твораў друкаваліся ў свой час толькі ў часопісах і газетах, іншыя хоць і выдаваліся да вайны асобна, але выданні гэтыя сталі бібліяграфічнай рэдкасцю.

Вытрымаўшы суровую праверку часам, лепшыя раннія творы К. Чорнага як-бы нанава ўваходзяць у нашу літаратуру. Пазнаёміўшыся з імі, чытач па-новаму ўбачыць і герояў пазнейшых твораў: панурага ўласніка Міхала Тварыцкага, трапяткога Краўца, дачасна сталую Ірыніку, Любу Лук'янскую. Жывымі ніцямі звязаны гэтыя вобразы з персанажамі «Зямлі», «Ідзі, ідзі», «Лявона Бушмара». Адна страсная думка аб чалавеку працы, рукамі якога створана ўсё самае каштоўнае на зямлі, праходзіць праз усе гэтыя творы.

Творчасць К. Чорнага гуманістычная ў поўным сэнсе гэтага слова. Яна прасякнута любоўю да чалавека, увагай да яго духоўнага свету. Праз усё жыццё пісьменнік пранёс душэўную цеплыню, якую абуджалі ў ім людзі.

Самі творы сведчаць аб выключнай «памяці сэрца» гэтага пісьменніка. Зразумела, К. Чорны як мысліцель, мастак і гуманіст з цягам часу рос, змяняліся і яго погляды на жыццёвыя з'явы, рэчы. Але адно было нязменным ва ўсіх творах — любоў да чалавека працы, да яго радасцей і думак. Як-бы ад імя гэтага чалавека Нявада ў «Пошуках булучыні» гаворыць: «Пазбірайце вы, кажу, золата з усяго свету, зрабіце з яго трон, пасадзіце на яго мяне кіраваць поўсветам, а каб увесь свет выхваляў мяне, дык я перад вамі буду прасіцца і маліцца: пусціце, калі ласка, дайце мне шчасце спаўзці з гэтага трона: я колькі год жыта не сеяў, кала нават не зачасаў, у кузні каня не каваў, у млыне мукі не малоў, раллі не нюхаў, ботаў не мазаў, капусты не сёрбаў, не наслухаўся ўволю, як пеўні спяваюць, як людзі па-людску гавораць».

Вялікая розніца паміж цёмнымі «палявымі людзьмі» першых замалёвак К. Чорнага і героямі рамана «Вялікі дзень», якія ўпрыгожылі зямлю сваімі разумнымі рукамі і якія самааддана абараняюць гэтую зямлю ад захопнікаў. Аднак і Максімка з аднайменнага апавядання 20-х гадоў, і Максім Астаповіч з рамана «Вялікі дзень» падняты з самых глыбінь народнага жыцця.

Адлюстроўваючы вялікія падзеі 20-х—40-х гадоў, К. Чорны не абмяжоўваўся паказам толькі тых хваль, што бушуюць на паверхні жыцця. Знешне яркае, рамантычнае нават менш цікавіць пісьменніка, чым тыя ледзь улоўныя, але непераадольныя плыні, якія ўзнікаюць «на глыбіні». І калі К. Чорны паказвае зрух у жыцці да новага, дык гэты зрух самы глыбінны, яго можа заўважыць толькі той, хто звязан сэрцам з чалавекам працы.

У большасці ранніх твораў пісьменніка вёска малюецца амаль «учарашняй». Бруд, забабоны, уласніцкі ідыятызм кідаюцца тут у вочы перш за ўсё. Але гэта толькі знешне. «Здаецца, тыя самыя дзеравянныя шэрыя сцены, ды ўжо новае туліцца за імі. Новае ў іх, новае ў людзях. Можа зразу яшчэ часам непрыкметнае, але ўжо моцнае» («Свята працы і свету»). У ранніх сваіх творах («Бульніковыя межы», «Новыя людзі», «Максімка» і іншыя) пісьменнік выяўляе ледзь адчувальныя, але арганічныя змены ў псіхалогіі людзей пад уплывам новай рэчаіснасці. Сама творчая манера пісьменніка была падпарадкавана задачам выявіць тое, што ў чалавека «на грані думак і пачуццяў».

Ад твора да твора раслі светапогляд і майстэрства К. Чорнага. Самую вялікую думку аб рэволюцыйных зменах у жыцці народа ён перадаваў, малюючы жыццё чалавека «самага звычайнага». Нічым асаблівым не вызначаецца жыццёвая біяграфія Максіма Астаповіча. Працавіты, ціхі, нават крыху праставаты, ён, здаецца, і не прымае асаблівага ўдзелу ў падзеях, што адбываюцца вакол яго. Але ў той упартасці, з якой будуе гэты селянін з панскага лесу хату, некалькі разоў раскідае яе па загаду акупантаў і зноў нанава будуе, мы адчуваем упартасць і сілу народа, які ўжо не выпусціць з рук таго, што дала яму рэволюцыя.

К. Чорны добра разумее, што канчатковай мэтай социялістычнай рэволюцыі з'яўляецца новы чалавек. І таму чалавек, яго псіхалогія—на першым плане і ў творах, прысвечаных будаўніцтву социялізма ў нашай краіне («Ідзі, ідзі», «Вясна», «Трэцяе пакаленне», «Люба Лук'янская»). Пісьменнік звычайна не захапляецца паказам знешніх прыкмет часу. Малюючы будаўніцтва электрастанцыі, ён можа «забыцца» апісаць агульную панараму новабудоўлі. Але самую нязначную змену ў псіхалогіі героя ён не праміне адзначыць. Вось у час закладкі электрастанцыі («Ідзі, ідзі») Зыдор Ніцкі знаёміць свайго сябра з жонкай: «А от мая... ведаеш... баба...».

Чуецца тут і нязвыклая ласка, і гордасць. Раней яму, вечна галоднаму бедняку-галетніку, і ў голаў не прыйшло-б пахваліцца сваёй жонкай. Ён, здаецца, і сам ніколі не заўважаў яе.

Літаратуразнаўцы прытрымліваюцца думкі, што ў рамане «Зямля» К. Чорны супрацьставіць маладое пакаленне цёмнай сялянскай масе. Такое супрацьстаўленне арганічна немагчымае для пісьменніка. Як ні высока ставіць ён такіх людзей, як Алесь з рамана «Зямля» ці Кастусь з аповесці «Вясна», але іх дзейнасць для яго мае значэнне іменна таму і толькі таму, што ўслед за гэтай неспакойнай крылатай моладдзю абуджаецца ўся працоўная сялянская маса. Асноўны ідэйны змест рамана «Зямля» і заключаецца ў паказе глыбінных працэсаў унутры сялянскай масы, якія азначаюць пачатак карэннай змены самога светаадчування чалавека працы.

Перадавыя людзі вёскі ў творах К. Чорнага (Алесь, стары Тамаш, Кастусь) малююцца як неаддзельная частка працоўнай сялянскай масы. У пазнейшых творах («Лявон Бушмар», «Нянавісць») гэтай масе супрацьстаўляецца кулак.

Сам К. Чорны, па сведчанню П. Глебкі, так вызначаў у 1943 г. пафас рамана «Зямля»: «Замілаванне да роднай зямлі, да прыроды, хараство народных звычаяў і вобразаў, хараство беларускіх простых людзей».

Выхад у свет Збора твораў К. Чорнага не можа не завастрыць увагу літаратуразнаўцаў і крытыкаў на многіх праблемах вывучэння спадчыны пісьменніка, якія даўно наспелі. Цяпер, калі чытач мае большую частку твораў К. Чорнага розных перыядаў, немагчыма будзе па-ранейшаму абыходзіць пытанні эвалюцыі яго творчасці, праблему станаўлення яго метаду, творчай манеры, стылю.

Асабліва нявывучанымі ў творчай біяграфіі пісьменніка з'яўляюцца 20-я гады. Творчы шлях да «года вялікага пералому» звычайна характарызуецца вельмі агульна: адзначаюцца асобныя ідэйна-тэматычныя прыкметы ранняй прозы К. Чорнага і такія яе недахопы, як натуралізм, біялагізм і г. д. І пры гэтым не робіцца ніякай спробы паказаць і растлумачыць складаны шлях яго фарміравання. Можна спаслацца на прадмову І. Кудраўцава да Збора твораў К. Чорнага. Супярэчнасці ранняй яго творчасці тут тлумачацца так:

«Праўда, малады пісьменнік часам празмеру захапляўся, і тады раскрыццё псіхалогіі чалавека, яго настрояў і пачуццяў ператваралася ў самамэту... «Пачуцці»—характэрная назва зборніка К. Чорнага, у якім найбольш выразна адбіўся час у творчасці пісьменніка, калі ён, імкнучыся да ўсебаковага паказу духоўнага стану чалавека, станавіўся на шлях празмернага захаплення псіхалогіяй героя, яго перажываннямі і настроямі. ... Сустракаюцца ў ранніх творах К. Чорнага элементы натуралізма. Аўтар часам з фатаграфічнай дакладнасцю перадае пэўны жыццёвы факт, здарэнне або выпадак з чалавекам. Так з'явіліся замалёўкі асобных дробязных гісторый, здарэнняў, малюнкі людскіх настрояў і перажыванняў...

Паводзіны асобных персанажаў раннягa Чорнага вызначае нейкая таямнічая сіла, закладзеная ў іх натуры.

... З такога памылковага—біялагічнага—пункту гледжання напісана, напрыклад, апавяданне К. Чорнага «Па дарозе» (1925 год).

Недахопам асобных ранніх апавяданняў пісьменніка з'яўлялася і тое, што ў іх невыразна выступала класавая дыферэнцыяцыя вёскі».

Усё гэта—толькі канстатацыя асобных якасцей і рыс ранніх твораў пісьменніка. Няма тут нават спробы паказаць ідэйна-мастацкую эвалюцыю пісьменніка, растлумачыць яе.

А між тым, не ўлічваючы творчай эвалюцыі пісьменніка, нельга па-сапраўднаму зразумець і растлумачыць асаблівасці яго творчай манеры.

Каб па-сапраўднаму раскрыць працэс станаўлення К. Чорнага як пісьменніка, нашаму літаратуразнаўству прыдзецца выйсці з вузкага кола прывычных фактаў і літаратурных паралелей, пакінутых крытыкай 20—30-х гадоў, на ацэнках якой моцна адбіліся групавыя інтарэсы. Думаецца, што час ужо пры аналізе творчасці беларускіх пісьменнікаў смялей улічваць працэсы, што былі характэрны для ўсёй совецкай літаратуры.

Сапраўды, ці многае можна зразумець у творчасці К. Чорнага 20-х гадоў, прывязваючы яго імя да імён некалькіх удзельнікаў «Узвышша» і не заўважаючы таго, што сам пісьменнік лічыў сябе блізкім да той шырокай плыні ў совецкай літаратуры, якую прадстаўлялі Л. Леонаў, Вс. Іваноў, Ал. Файко і іншыя.

Думаецца, не выпадкова тое, што першы раман К. Чорнага «Сястра» (1927 г.) усё яшчэ застаецца па-за ўвагай літаратуразнаўцаў. Калі зыходзіць толькі з факта ўдзелу К. Чорнага ва «Узвышшы», немагчыма растлумачыць ідэйна-мастацкі змест і недахопы гэтага рамана. Неабходна паставіць яго ў шэраг такіх твораў 20-х гадоў, як «Злодзей» Л. Леонава, «Еўграф—шукальнік прыгодаў» Ал. Файко. Многія совецкія пісьменнікі, як і К. Чорны, пачалі з услаўлення, паэтызацыі народнай сілы, якую абудзіла рэволюцыя. І многія з іх, у тым ліку і К. Чорны, перажылі перыяд, калі на першы план у іх творах выступілі будні НЭП'а, шэрыя, няяркія. Лірычны, эмацыянальны пафас «прытухае» ў гэтых творах. Затое ўзмацняюцца натуралістычныя тэндэнцыі. У літаратуру прыходзіць герой, які жыве «тварам у мінулае». Ён не заўважае ніякай сувязі сучаснасці з героікай грамадзянскай вайны. Вакол сябе ён бачыць толькі нэпманаў. Не знайшоўшы свайго месца ў гераічных паслярэволюцыйных буднях, былы камісар Міцька Векшын («Злодзей») таксама, як і Еўграф з п'есы Ал. Файко, здольны толькі люта ненавідзець сытага нэпмана і блытацца пад нагамі тых, хто ў будзённай працы змагаецца з нэпманам. Да гэтых літаратурных тыпаў непасрэдна прымыкае і Ваця — галоўны персанаж рамана К. Чорнага

ТАЛЕНТ АБАВЯЗВАЕ

Чым прыгажэй робіцца наша жыццё і чым ярчэй раскрываецца прыгожасць чалавека савецкай краіны, тым прыкметней кідаецца ў вочы бруд і пошласць таго старога, што звычайна завецца перажыткам мінулага. Пошласць перашкаджае нашым людзям плённа працаваць, шчыра любіць, з радасцю сустракаць светлае ранне і развітвацца з ціхім святлом вячэрняй зары. Пошласць—наш вораг. Яна шкодзіць і абражае не толькі асобнага чалавека, а ўсё грамадства. Нейкі час барацьбу супраць яе крытыка давярала весці гумарыстам ды сатырыкам. Калі-ж супраць пошласці накіроўвалі зброю лірыкі ці эпікі, той-сёй з нас, крытыкаў, бурчэў: ці варта займацца другарадным, навошта страляць з гармат па вераб'ях... А гэтыя «вераб'і», між іншым, лічылі, што ім трэба асцерагацца аднаго «Вожыка».

Тры новыя апавяданні Янкі Брыля, змешчаныя ў сёмым нумары часопіса «Полымя», маюць, на нашу думку, прынцыповае значэнне. Талент гэтага пісьменніка вызначаецца шчырай павагай да простых людзей, да радавых удзельнікаў будаўніцтва комунізма. Ён не шкадуе натхнёных і яркіх фарбаў, калі стварае іх вобразы. У лепшых брылеўскіх творах гучыць пранікнёная лірычная песня аб чыстым унутраным свеце чалавека, вартага ўдзячнасці за сваю працу, за свае пачуцці, імкненні, задумы. Да гэтага часу пісьменнік бачыў і паказваў, як гэты радавы, сціплы і высокародны чалавек сутыкаецца з ворагам, які знаходзіцца па другі бок барыкад або перабягае ў лагер нашых праціўнікаў. Як вядома, мастак дасягнуў поспехаў і падараваў нашай літаратуры добрыя творы.

Калі прырода таленту—гуманістычная, калі любоў да чалавека ў яго сапраўдная, ён не можа мірыцца з гэтымі, на першы погляд, дробнымі адмоўнымі з'явамі, якія, аднак, глыбока варожыя нашаму ладу. Ад вачэй Я. Брыля, чыё пяро, здаецца, больш за ўсё схільнае маляваць добрае, прыгожае, на гэты раз не схавалася пошласць.

Бывае, што крытыкі блытаюць паняцце радавы чалавек з паняццем «маленькі герой». Маленькі—гэта шэрая істота, якая дыхае паветрам, есць, нават тое-сёе робіць. Аднак «маленькі герой» у грамадскай, а значыць і мастацкай увазе да сябе не зацікаўлены. Радавы-ж чалавек, бывае, і працуе на самай сціплай пасадзе, і пачуцці свае выказвае рэдка, наогул вядзе сябе непрыкметна. Але ў адрозненне ад «маленькага», ад шэрага героя, ён разумее жыццё ўласнае як абавязак быць карысным для суайчыннікаў, сяброў, таварышаў, быць неабходным краіне. Гэта—вінцік, без якога цяжка ўявіць дзяржаўны механізм у дзеянні.

Янка Брыль піша ад простых людзях. Міша Траявіцкі з апавядання «Памылка» — загадчык цырульні, крышталька сумленны чалавек. І вось ён сустрэў пошласць, якая ўселася ў крэсла старшыні арцелі, не вытрымаў абразы з боку гэтай агіднай пошласці і... выпіў атруту. Як гэта здарылася? Старшыня арцелі абвінаваціў яго ў крадзежы сурвэтак.

Тонка і натуральна Я. Брыль падказвае нам, чытачам, што пошласць не толькі забіла сумленнага і, бадай, сапраўды слабага чалавека, яна парушыла спакой і працу калектыву совецкіх радавых людзей, пазбавіла іх на пэўны час радасці, бо нельга радавацца сонцу і ўсмешкам дзяцей, калі побач з намі гіне сумленны чалавек. Спынілася адно сэрца—балюча сэрцам многіх.

Гэта — павучальнае апавяданне. Яно ўзбройвае чытача нянавісцю, а нянавісць—добрая зброя ў барацьбе супраць пошласці.

Такое значэнне апавядання «Памылка». Яно, гэтае значэнне, характарызуе і два астатнія творы—«Субардынацыя» і «Прывал». Янка Брыль усё больш дасканала авалодвае майстэрствам абмалёўкі псіхалагічнай глыбіні чалавека. Прачытаўшы яго новыя апавяданні, мы запомнілі не толькі тое, што здарылася з героямі, але і тое, як гэта ўсё было. Мы ўбачылі і цырульню, і святочную плошчу ў Мінску напярэдадні параду, і кабінет ваяўнічай пошласці—Фамута. Мы нібы прайшліся з персанажамі брылеўскіх твораў, адчулі іх дыханне, зазірнулі ім у вочы.

Вось пісьменнік уводзіць нас у кабінет да «таварыша Лопуха». Мы слухаем «таварыша Лопуха», адразу-ж пазнаючы добры дзесятак «лопухаў», якія яшчэ сустракаюцца ў нашым грамадстве:

«— Быў у мяне нядаўна Уладзімір Канстанцінавіч Дарожка. Памятаеце: Валодзька, яшчэ з партызанскай газеты? Цяпер ужо даволі салідны таварыш і на даволі адказнай працы. І—як ні дзіўна—піша таксама. Вы ўсё больш, як я чуў, у сэнсе фельетонаў... Вельмі правільна, зрэшты, — крытыка знізу ў сучасны перыяд нам з вамі вельмі патрэбна. А таварыш Дарожка напісаў гісторыю нашай партызанскай брыгады. Уся, так сказаць, эпапея. Я пакуль што не меў магчымасці грунтоўна пазнаёміцца з яго работай, але наколькі мяркую з яго расказаў, нашы з вамі імёны таксама займаюць там адпаведнае месца».

І далей:

«... Я па сваёй лініі, параіўшыся ў адпаведных інстанцыях, зраблю, што палічу магчымым і неабходным, а вас, як чалавека, які валодае пяром, і наогул, паколькі вы цяпер у сталіцы, прашу дапамагчы гэтай справе па сваёй, так сказаць лініі. Падшліфаваць там, скажам, літаратурны стыль, паглядзець наконт сюжэта і пасобных эпізодаў, ну, і закінуць слова ў рэдакцыі...»

Не ведаем, ці ўсе пагодзяцца з намі, але трапная характарыстыка Лопуха нагадвае лепшыя ўзоры пісьма Чэхава, Горкага, Коласа. І гэта добра. Выкрывальны пафас, нацэлены супраць пошласці, вымагае скарыстання вопыту класікаў.

Дарэчы будзе сказаць, у гэтых трох апавяданнях мы адчулі, якія выдатныя драматургічныя здольнасці пакуль што беражэ Я. Брыль. Па сутнасці, гэтыя навелы—п'есы. Па-майстэрску пабудаваны канфлікт, у дыялогах выяўлены рысы мастацкіх вобразаў, вытрымана напружанне ў дзеянні.

Аднак, думаецца, Я. Брылю трэба звярнуць увагу на наступную акалічнасць.

Як гэта ні дзіўна, у яго ваяўнічых апавяданнях адчуваецца пэўная сузіральнасць. Недзе ў канцы аўтар як быццам пераходзіць на пазіцыі абароны, і абароны пасіўнай. Станоўчыя героі амаль нечакана з добрых радавых людзей нашага грамадства ператвараюцца ў «маленькіх герояў». Няхай гэта здарылася-б у адным апавяданні, дык — не! У кожным Я. Брыль прымушае сціплага чалавека быць сціплым да крыўднага бяссілля. Тут ужо недалёка да таго, каб радавы герой стаў шэрым.

Карэспандэнт, ад імя якога вядзецца апавяданне ў «Субардынацыі», выйшаў з кабінета «таварыша Лопуха», думае: «... Мне знайсці-б толькі той пракляты момант у жыцці чалавека, калі ён пачынае рабіцца свіннёй,—каб налажыць на яго, на той зародак хамства, абмежавальнік, а потым, калі спатрэбіцца, дык ужыць і глыбінны ліфт...

Ды гэта мне, відаць, не ўдасца...

Застаецца адно — напішу я пра Лопуха фельетон».

Прыблізна такія-ж пасіўныя ноткі гучаць у апавяданнях «Прывал», «Памылка». Героі таксама сутыкнуліся з ваяўнічай пошласцю, разгледзелі яе і... пайшлі ад яе прочкі.

Зразумела, лягчэй за ўсё дакараць пісьменніка за тое, што ён зрабіў не так, як хацелася-б нам, чытачам. Але тут вымушае дакараць аднагучная нотка пасіўнага пратэсту супраць пошласці. Як-жа нам быць, Янка Брыль, калі мы, дзякуючы і тваім апавяданням, разгледзім якога-небудзь Жэньку Лопуха ці Барыса Барысавіча Фамута? Фельетон ёсць фельетон, але нам трэба ведаць і іншыя сродкі барацьбы.

Цікава, што ў вераснёўскім нумары часопіса «Звезда» з'явілася апавяданне «Смяцінка ў воку» Дм. Острова, дзе таксама, як і ў «Памылцы» Я. Брыля, сціплы афіцыянт рэстарана памірае ад таго, што ваяўнічая пошласць у асобе аднаго кар'ерыста абразіла радавога совецкага чалавека. Апавяданне заканчваецца некалькі «лабавым» прыёмам пакарання пошласці. Усе людзі, якія ведаюць пра ўчынак носьбіта пошласці, паўстаюць на яго шляху і выкрываюць нягодніка з кандыдацкім званнем вучонага. У Дм. Острова чытач, вядома, зможа запытаць: а што, калі-б гэты нягоднік і забойца не спрабаваў улезці ў партыю, што тады зрабілі-б героі апавядання? І ўсё-ж, задаючы падобнае пытанне, мы не маглі-б абмінуць актыўнай, наступальнай пазіцыі аўтара.

Калі-б Я. Брыль знайшоў для сваёй пазіцыі, актыўнай і наступальнай, патрэбнае ідэйна-мастацкае абгрунтаванне, яго па-сапраўднаму новыя, свежыя і добрыя апавяданні можна было-б вітаць безагаворачна. Талент пісьменніка абавязвае знаходзіць гэта.

Барыс БУР'ЯН.

Вераніка ПАРУМБАКУ,
румынская паэтэса

Мой дар

Цуд гэты адбываецца заўсёды,
Вякамі сняць і верацъ у яго.
У ім надзея новага ўзыходу
І сэнс быцця народа усяго.

Мы не маглі тады, ў часы пакуты,
Прыход дзіцяці шчасцем азарыць.
А зараз рукі нашыя раскуты,
Каб гэту мару яваю зрабіць.

Але жыццё — кароткая дарога,
Да мэты з нас не кожнаму дайсці,
Ды ты, мой сын, зрабіці мусіш многа
І шмат чаго дасягнеш ты ў жыцці.

Я маці! Шчыра і лагодна
Я сына прыціскаю да грудзей.
Увесь свет—мой дар! Прымі яго, мой родны,
І узнімай усё вышэй, вышэй.

Пераклаў Антон Бялевіч.

Месячнік
румына-совецкай дружбы

Шырока раскрыліся дзверы да шчасця раней прыгнечанаму румынскаму народу пасля жніўня 1944 года, калі гераічная Совецкая Армія вызваліла краіну ад фашысцкай няволі. З таго часу мінула адзінаццаць год — тэрмін для гісторыі невялікі. Але як многа зрабіў для свайго шчасця свабодны народ! Выраслі новыя гарады і пасёлкі, пабудаваны і паспяхова працуюць новыя фабрыкі і заводы, узведзены прыгожыя светлыя будынкі клубаў, тэатраў, бібліятэк.

Натхнёна будуе новае жыццё румынскі народ. Каля двухсот прадпрыемстваў краіны выканалі пяцігадовы вытворчы план на дзевяць месяцаў раней тэрміну. Значных поспехаў дасягнула сялянства Народнай Румыніі. Заможнае, радаснае жыццё прыйшло ў кожны дом былога батрака і бедняка. На вёсцы цяпер працуе звыш дванаццаці тысяч дамоў культуры, у якіх наладжваюцца мастацкія вечары, чытаюцца лекцыі, дэманструюцца кінофільмы.

За пасляваенныя гады з'явілася нямала таленавітых твораў румынскіх пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў. Новымі добрымі спектаклямі парадавалі гледача драматычныя і оперныя тэатры Румыніі.

Усе надзеі на светлую будучыню сваёй краіны звязаны ў румынскага народа з Совецкім Саюзам, з яго бескарыслівай дапамогай. З верай у новыя перамогі ідзе румынскі народ па шляху социялізма і міру.

Месячнік румына-совецкай дружбы, які цяпер шырока адзначаецца ў абодвух краінах, будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню дружбы і культурных сувязей паміж румынскім і совецкім народамі.

Збор твораў К. Крапівы

Сёлета Дзяржаўнае выдавецтва БССР распачало выданне трохтомнага Збора твораў буйнейшага беларускага сатырыка і драматурга Кандрата Крапівы.

Першы том ужо знаходзіцца ў вытворчасці і ў хуткім часе выйдзе ў свет. У ім змяшчаюцца паэтычныя творы К. Крапівы — вершы, байкі, паэмы, вершаваныя фельетоны.

Другі том ахопіць прозу пісьменніка: апавяданні, фельетоны і раман «Мядзведзічы». Сюды-ж уключаюцца паасобныя літаратурна-крытычныя артыкулы і працы па пытаннях мовазнаўства.

У трэці том увойдуць драматычныя творы.

Выданне будзе завершана ў наступным годзе.

На кніжнай паліцы

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж кнігі мастацкай літаратуры:

Пімен Панчанка. «Шырокі свет». Вершы. Тыраж 8 тыс. экз. стар. 108. Цана 2 руб. 50 кап.

Віліс Лацис. «Да новага берага». Раман. Пераклад А. Кучара. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 580. Цана 12 руб. 95 кап.

Іван Сіняўскі. «Піонерскі гальштук». Апавяданні. Малюнкі М. Бельскага. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 96. Цана 2 руб. 25 кап.

Багдан Чалы. «Сустрэчы». Вершы. Аўтарызаваныя пераклады з украінскай мовы М. Аўрамчыка, П. Панчанкі, Ул. Шахаўца, А. Вялюгіна. Малюнкі П. Калініна. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 76. Цана 1 руб. 85 кап.

А. Пушкін і А. Міцкевіч у Пецербургу.

Карціна мастака А. Шыбнёва.

Малады Міцкевіч і яго асяроддзе

У адным з пісем да свайго сябра Аляксандра Хадыкі Адам Міцкевіч з вялікай любоўю і павагай гаварыў аб беларускім народзе, яго мове, фальклоры. Ён пісаў: «...з усіх народаў славянскіх Русіны, г. зн. мужыкі Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў, захавалі найбольш славянскіх традыцый. У іх байках і вершах ёсць усё... Мова іх адна з найбольш мілагучных. Народ гэты на працягу ўсёй гісторыі жыў у бядзе і прыгнёце. Нават зямля, на якой жыве, — бедная, сухая, неўраджайная, пяскі або балоты».

Гэта было напісана Міцкевічам у 1847 г., калі за ім трывала замацавалася слава вялікага польскага нацыянальнага паэта. Але яшчэ ў маладыя гады, калі паэт вучыўся ў Віленскім універсітэце, а затым настаўнічаў у Коўна, ён нязменна праяўляў добрыя, брацкія пачуцці да Беларусі. Каларытам беларускай мовы, прыроды Гродзеншчыны, матывамі народных беларускіх песень і казак прасякнуты многія яго творы.

Увага маладога Міцкевіча да Беларусі ў значнай меры праявілася ў дзейнасці гуртка «Філаматаў», душою якога ён быў. Аўтарытэт паэта сярод філаматаў быў вельмі высокі. Няма сумнення, што дух павагі да беларускага народа, яго культурнай спадчыны і вусна-паэтычнай творчасці, які панаваў у гуртку, абумоўлены ў першую чаргу той выдатнай роляй, якую адыгрываў Міцкевіч у філамацкім руху.

Члены тайнага патрыятычнага гуртка польскіх студэнтаў-філаматаў, якія групаваліся навокал Міцкевіча, у сваёй большасці варожа ставіліся да самаўладства, прапаведвалі ідэю барацьбы за вызвалачэнне сваёй радзімы. Дзекабрысты К. Рылееў і А. Бестужэў лічылі Міцкевіча і яго сяброў-філаматаў Ежоўскага і Малеўскага блізкімі сабе «па пачуццю і складу думак» людзьмі, «сваімі», маючы пры гэтым на ўвазе не толькі паэтычную, але і ідэйную роднасць.

Міцкевіч і іншыя члены гуртка адмоўна адносіліся да пропаведзі нацыянальнай варожасці ў адносінах да рускага і беларускага народаў, якая характэрна была для кіраўнікоў Віленскага універсітэта і рэакцыйнай прафесуры.

Філаматы вывучалі геаграфію Беларусі, народны быт, збіралі этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы. У Малеўскага, напрыклад, была запісная кніжка, куды ён запісваў беларускія прыказкі, словы, трапныя народныя выразы. Ён добра ведаў гісторыю Беларусі, якую называў «сваім родным краем».

Я. Ежоўскі звярнуўся ў 1821 г. да настаўніка Мазырскага вучылішча Архімовіча з просьбай апісаць яму быт «навакольных жыхароў», жыццё вучняў і метады навучання. У пісьмах да іншых сваіх знаёмых Ежоўскі прасіў запісаць для яго вясельны абрад беларусаў, найбольш цікавыя народныя песні.

Паводле спецыяльна складзенай інструкцыі, усе філаматы абавязаны былі сістэматычна вывучаць эканоміку, геаграфію тых мясцін, дзе яны жылі, знаёміцца з этнаграфіяй, фальклорам. Не толькі Міцкевіч, Ежоўскі і Малеўскі, але і Т. Зан, Я. Чачот і іншыя члены гуртка былі ўраджэнцамі Беларусі.

Адзін з польскіх даследчыкаў дзейнасці тайных арганізацый віленскіх студэнтаў адзначае, што ў сваіх творах філаматы і філарэты ахвотна карысталіся народнымі беларускімі выразамі. Ён-жа прыводзіць вялікі рэестр беларускіх слоў, пачэрпнутых з твораў сяброў Міцкевіча па гуртку філаматаў, а таксама з твораў членаў гуртка філарэтаў.

Міцкевіч, Ежоўскі, Малеўскі і іншыя філаматы з вялікай цікавасцю сачылі за творчасцю Я. Чачота, якая ў той час яшчэ не насіла характару адкрытай рэлігійнасці, закліку да маральнага ўдасканалення і непраціўлення прыгнятальнікам. Калі ў 1821 г. узнікла думка выдаць паэтычны зборнік «Геба», вырашана было ўключыць туды побач з творамі Міцкевіча і вершы Чачота.

На адным з пасяджэнняў гуртка Міцкевіч выступіў з падрабязным крытычным разглядам верша Чачота «Купала», тэкст якога, на жаль, не захаваўся.

Думаецца, не без уплыву Міцкевіча напісаны такія вершы Чачота, як «Да пакіньце горла драць», «Тыртэй», «Імяніннае пасвяшчэнне», адзначаныя рысамі маладога задору, жыццерадаснасці, паўнымі крытычнымі адносінамі да рэчаіснасці. Так, напрыклад, у драматызаваным вершы «Імяніннае пасвяшчэнне» аўтар гаворыць пра асэсара, які жорстка абыходзіцца з сялянамі, карае іх за невялікую правінасць. Вуснамі беларускага селяніна высмейваюцца тыя паны, якім беларуская мова «вушы свідруець».

Філаматы імкнуліся ўстанавіць сувязь з тайнымі антыўрадавымі арганізацыямі, якія былі на тэрыторыі Беларусі, у прыватнасці з так званым свіслацкім «науковым» таварыствам. Сувязь з гэтай арганізацыяй ажыццяўлялася праз студэнта Віленскага універсітэта М. Рукевіча і настаўніка старажытнай славеснасці Свіслацкай гімназіі Шыпульскага, які з'яўляўся членам гуртка філарэтаў.

У Гродзенскім філіяле Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіву БССР захоўваецца справа «О студентах Виленской Академии и Свислочской гимназии, подозреваемых в принадлежности к тайным обществам» (Ф. І, оп. 2, св. 30, с. № 246). Тут ёсць матэрыялы, якія датычаць вучняў і настаўнікаў, уваходзіўшых у «науковае таварыства». У прыватнасці ўказваецца, што вучні Антон Глазер і Павел Зенковіч наўмысна закрэслілі на класнай дошцы слова «государь», за што былі адданы ў салдаты 48 егерскага палка, а настаўнік Шыпульскі даваў «ученикам неприличные темы для упражнений». Хваляванні сярод свіслацкіх вучняў прымусілі ўлады ўстанавіць у Свіслачы паліцыю і, апроч таго, раскватаваць там роту салдат.

М. Рукевіч зблізіўся таксама з перадавымі афіцэрамі Літоўскага піонерскага батальёна Ігельстромам, Вегеліным і Гофманам. Сам Рукевіч з'яўляўся членам гуртка філаматаў. Пад адным з дакументаў гэтага гуртка побач з імёнамі Малеўскага, Зана і іншых стаіць подпіс М. Рукевіча.

Рукевіча прыцягнулі да суда ў 1824 г. па справе тайных гурткоў віленскіх студэнтаў. Але яму неяк удалося даказаць сваю невіноўнасць і пазбегнуць кары. Ён быў адпушчаны на волю з абавязацельствам «впредь ни к каким обществам не принадлежать».

Калі Ігельстром і Вегелін арганізавалі на тэрыторыі Беларусі тайнае «Таварыства ваенных сяброў», якое з'явілася водгукам на дзекабрысцкі рух, Рукевіч стаў яго актыўным членам, завербаваў туды і іншых грамадзянскіх асоб: настаўніка Свіслацкай гімназіі Ф. Ардынскага, «качцылярыста А. Вронскага, калежскага рэгістратара А. Грынеўскага.

Члены «Таварыства ваенных сяброў» вялі агітацыю сярод салдат. Іх намаганнямі было сарвана прынясце прысягі піонерскім батальёнам Нікалаю І.

Некаторыя матэрыялы, якія адносяцца да дзейнасці гэтай арганізацыі, знаходзяцца ў архіўнай справе «О командировании уездного маршала по судебному делу капитана Литовского пионерского батальона Игельстрома и других, принадлежащих к тайным обществам» (Філіял ЦДГА БССР, Гродна, Ф. І, оп. 2, св. 134). Рукевіч унушыў Ігельстрому думку аб арганізацыі бунта сярод войск Літоўскага асобнага корпуса, для чаго раіў яму пасляць у палкі адданых людзей.

Рукевіч жыў у вёсцы Залыкі Гродзенскай губерні. Сюды часта прыязджалі Ігельстром, Вегелін і іншыя члены таварыства. Час-ад-часу яны праводзілі там свае нарады.

Пасля раскрыцця ўладамі дзейнасці «Таварыства ваенных сяброў» М. Рукевіч быў сасланы на катаргу. Ігельстром і Вегелін адбывалі пакаранне ў Сібіры разам з дзекабрыстамі.

«Таварыства ваенных сяброў» заснавалася пасля разгрому тайных гурткоў польскіх студэнтаў у Вільні. Але з яго будучымі кіраўнікамі Ігельстромам і Вегеліным Рукевіч мог пазнаёміць сваіх віленскіх сяброў значна раней. Ва ўсякім выпадку, калі нават выключыць гэта меркаванне, дык сам факт удзелу філамата Рукевіча ў дзейнасці «Таварыства ваенных сяброў» сведчыць, што некаторым філаматам былі блізкія ідэі рускіх дзекабрыстаў.

Усё гэта, вядома, мае прамыя адносіны да маладога Міцкевіча, які быў знаёмы з Рукевічам. Не без ведама, а магчыма па ўказанню Міцкевіча, філаматы наладжвалі сувязь з антыўрадавымі таварыствамі і групамі, якія дзейнічалі ў Беларусі.

Нават пасля ліквідацыі гуртка філаматаў паасобныя яго члены працягвалі цікавіцца Беларуссю, яе гісторыяй, людзьмі, якія пісалі на беларускай мове. У «Альбоме» Вярыгі-Дарэўскага (захоўваецца ў ЦДА Літоўскай ССР, ВБФ—722) знаходзіцца некалькі вершаў паэта Адынца: «Дух, справа, прагрэс», «Дзецям Адама», «Да Арцёма Вярыга». Адынец быў знаёмы з В. Дуніным-Марцінкевічам.

Брацкія адносіны вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча да Беларусі і яе народа служылі прыкладам для яго сяброў па філамацкай арганізацыі.

Ісідар БАС.

Выдаваць матэрыялы фальклорных экспедыцый

Публікацыя твораў беларускага фальклору і асабліва фальклору совецкай эпохі мае вялікае значэнне.

Фальклор — багацейшая скарбніца духоўнай культуры народа, яго працоўнага вопыту. Ён уплывае на развіццё нацыянальнай літаратуры, музыкі, жывапісу, садзейнічае культурнаму росту працоўных.

Ужо многа год вядуцца марныя спрэчкі навокал пытання: «Ці існуе наогул совецкі фальклор?» Публікацыя матэрыялаў, якія запісваюцца ўдзельнікамі шматлікіх фальклорных экспедыцый, з'явілася канкрэтным адказам на гэтае пытанне. Масавымі тыражамі выйшлі зборнікі рускага, украінскага, грузінскага фальклору.

Узнікла неабходнасць выдання зборнікаў беларускай вуснай народнай творчасці, бо тое, што выдавалася раней, даўно стала бібліяграфічнай рэдкасцю.

Штогод у розныя раёны Беларусі выязджаюць дыялекталагічныя і фальклорныя экспедыцыі, якія збіраюць багата рознастайных твораў вуснай народнай паэзіі. Публікацыя гэтых каштоўных матэрыялаў часцей за ўсё церпіць няўдачу з прычыны зняважлівых, пагардлівых адносін кіраўнікоў выдавецтваў. І толькі нядаўна Гомельскі абласны Дом народнай творчасці выпусціў зборнік «Сучасныя народныя песні і частушкі» (склаў П. Ахрыменка). Творы, змешчаныя ў ім, прадстаўляюць вялікую цікавасць. У іх адлюстраваліся падзеі сучаснасці—барацьба за ўздым сельскай гаспадаркі, за ўкараненне новых, перадавых метадаў працы ў прамысловасці. Змешчаны ўзоры сучаснага рабочага фальклору.

Але выдадзены гэты зборнік непрадумана. Знаёмячыся з матэрыяламі, вы не зможаце даведацца, дзе і калі запісаны асобныя творы, хто іх выканаўца, як шырока яны распаўсюджаны. Зборнік выдадзены маленькім памерам. У ім не знайшлося месца для навуковай пашпартызацыі матэрыялу, без якой фальклорныя творы амаль не маюць навуковай каштоўнасці. Не знайшлося месца і для значнай часткі песень і частушак, запісаных у выніку чатырох экспедыцый. Змешчана ўсяго 10 песень і 43 частушкі. Больш таго, зборнік гэты не паступаў у продаж, аб ім амаль ніхто не ведае за межамі вобласці.

Усё гэта сведчыць аб пагардлівых адносінах да выдання твораў беларускага фальклору.

Вядома, што ў выніку штогодніх фальклорных і дыялекталагічных экспедыцый у Гродзенскім, Магілёўскім, Гомельскім, Мазырскім і іншых педінстытутах рэспублікі накапілася шмат запісаў фальклорных твораў розных жанраў. Лепшая частка іх павінна быць надрукавана. Сучасны фальклор адлюстроўвае духоўныя багацці нашага народа, і яго запісы павінны стаць здабыткам шырокіх мас.

К. КАБАШНІКАЎ.

«Сястра». Ён таксама бунтуе супраць сытага, мёртвага мяшчанскага балота і таксама, як і героі Л. Леонава і Ал. Файко, па сутнасці не падымаецца над гэтым балотам. У рамане К. Чорнага ёсць нават «Векшын—наадварот». Гэта былы камісар Ватсон, які стаў цырульнікам, а потым «соўчыноўнікам», зрабіўся абываталем.

Не маючы сіл разабрацца ў складаных закономернасцях рэчаіснасці, пісьменнік пачынае шукаць у чалавечай псіхалогіі, у свеце падсвядомага адказы на пытанні грамадскага жыцця, якія яго хвалююць. Так узнікае зборнік «Пачуцці»—своеасаблівы літаратурны эксперымент над чалавечай псіхалогіяй. Так з'яўляецца і раман «Сястра», у якім пісьменнік падмяніў свой ранейшы дэвіз «чалавек—гэта цалы свет» новым — «свет — гэта чалавек». Грамадскія з'явы ён спрабуе тлумачыць у гэтым творы, выходзячы з «низведаных» таямнічых законаў чалавечай псіхалогіі.

Праўда, пры разглядзе рамана «Сястра» неабходна ўлічваць, што многае тут ішло ад нявопытнасці, ад пошукаў уяўнай «глыбіні», многа ў гэтым творы чужога, вычытанага. Цікава, што ў адзін год з «Сястрой» (1927 г.) К. Чорны стварае раман «Зямля». Звярнуўшыся да найбольш блізкай, знаёмай яму тэмы народнага жыцця, пісьменнік у асноўным пераадольвае недахопы, звязаныя з манерай «індывідуальнага псіхалагізма».

Між іншым, многае ў ацэнках «Зямлі» патрабуе перагляду. Услед за крытыкай 20-х гадоў, «па інерцыі», нашы літаратуразнаўцы паўтараюць сцверджанне, быццам у рамане «Зямля» на К. Чорнага ўплывала нацыяналістычная тэорыя бясклясавасці беларускага народа. Як довад, прыводзіцца ў гэтым выпадку тое, што пісьменнік не паставіў у цэнтры ўвагі класавую барацьбу, не зрабіў яе асновай канфлікту. Сапраўды, барацьба з кулаком не стаіць у цэнтры рамана «Зямля». Аднак неабходна ўлічваць, што праблема новай вёскі, якая ставіцца ў творы, для свайго часу была надзвычай важнай. Да гэтай праблемы звярталіся ў 20-х гадах буйнейшыя пісьменнікі М. Шолахаў, Л. Леонаў, К. Федзін, Я. Колас, Л. Сейфуліна і інш. У перыяд індустрыялізацыі іх не магло не хваляваць пытанне: як сялянскай масе пераадолець спрадвечны недавер да горада, да ўсяго новага, не абжытага дзядамі, і пайсці новым социялістычным шляхам?

Асобныя пісьменнікі, не ўлічваючы тых змен, што адбыліся на вёсцы пад уплывам рэвалюцыйных падзей, не разумеючы дваістай прыроды селяніна, схільны былі разглядаць селяніна як абавязковага кулака «па нутру». Іменна з гэтых заганных пазіцый вульгарызатарская крытыка 20-х гадоў закрэслівала нашу рэвалюцыйна-дэмакратычную спадчыну. Раман К. Чорнага атрымаў тады таксама вульгарызатарскую ацэнку, якая яшчэ і цяпер «гіпнатызуе» наша літаратуразнаўства.

«Зямля», як і аповесць Я. Коласа «На прасторах жыцця», прымыкала да тых твораў 20-х гадоў, у якіх селянін маляваўся ў духу лепшых гуманістычных традыцый класікі, у якіх з глыбокай верай у сілу большэвіцкіх ідэй, у розум і класавае пачуццё працоўнага сялянства паказваўся агульны працэс збліжэння вёскі з пролетарскім горадам. Сяляне «Зямлі» цяжка, з аглядкай, але ўсё-ж ідуць насустрач новаму. Магчыма таму, што К. Чорны ў той час недастаткова выразна ўсведамляў шляхі вёскі да социялізма, ён схіляўся да некалькі абстрактнай пастаноўкі гуманістычнай праблемы «душы селяніна».

Творчасць пісьменніка 30-х гадоў асабліва цікавая з пункту гледжання яе мастацкага росту. Пры распрацоўцы гэтага пытання таксама неабходна арыентавацца на больш шырокае кола фактаў, чым гэта звычайна робіцца. Тое, што пісьменнік з першых апавяданняў свядома рыхтаваў сябе да ролі раманіста, вельмі пашырала кола яго літаратурных інтарэсаў. Імкнучыся авалодаць высокай культурай творчасці, ён усё жыццё настойліва вучыўся ў рускіх і заходніх класікаў рэалізма.

Цікава адзначыць, што асабліва захапленне К. Чорнага непераўзыйдзенымі творамі Л. Талстога, як і ў многіх рускіх совецкіх пісьменнікаў, блізкіх яму па творчых пошуках (Л. Леонаў, К. Федзін), прыпадае на другую палову 30-х гадоў. Творчая вучоба ў Л. Талстога найбольш адчуваецца ў аповесці «Люба Лук'янская», якая, на нашу думку, усё яшчэ недаацэнена літаратуразнаўствам. За кампазіцыйнымі недахопамі літаратуразнаўцы часам не заўважаюць вышынь псіхалагічнага майстэрства пісьменніка, дасягнутых у гэтым творы. Ненавісны К. Чорнаму свет мяшчанства ў аповесці «Люба Лук'янская» выкрываецца з выключнай сілай. Вобразы бацькі і сына Стафанковічаў, Вэні Шпулькевіча раскрыты з гранічнай псіхалагічнай паўнатой. Нідзе, нават у «Трэцім пакаленні», псіхалагічны малюнак не набываў такой адчувальнасці, «контурнасці».

У ранніх творах і нават у «Трэцім пакаленні» для пісьменніка характэрны празмерна «аголены» псіхааналіз. Вельмі дасканала, скрупулёзна перадаецца, што **адчуваў** Міхал, шукаючы грошы, але мы не можам выразна ўявіць, як **выглядаў** у гэтую хвіліну герой, мы не **бачым** яго.

А вось Яна Стафанковіча, што-б ён ні рабіў, мы бачым «з ног да галавы». Бачым, калі ён яшчэ ў поўнай сіле, высокі і рухавы, «прабіваецца» да «свайго» куска, хітруючы і жульнічаючы перад кожным, нават калі яму патрэбна самая дробязь—цыгарка. Унутранае і знешняе аблічча героя заўсёды непадзельна зліты ў нашым успрыйманні. Калі наступае душэўны крах героя, калі душа яго сціснулася ад прадчування апошняга ўдара, ён пачынае здавацца нам нават ростам меншым.

Творчасць такога пісьменніка, як К. Чорны, не можа не ставіць перад літаратуразнаўствам мноства складанейшых праблем. Вырашыць іх немагчыма, не выйшаўшы з кола фактаў і ацэнак, пакінутых нам крытыкай мінулых гадоў. Гаворка ідзе аб пашырэнні кола фактаў, якія далі-б магчымасць разглядаць беларускую літаратуру як неадзельную частку ўсёй совецкай літаратуры. Выхад у свет збораў твораў лепшых нашых пісьменнікаў—Я. Купалы, Я. Коласа, Зм. Бядулі, Э. Самуйлёнка і інш. значна палягчае даследчыкам-літаратуразнаўцам гэтую задачу.

Шкада толькі, што нават такое сур'ёзнае выданне, як шасцітомнік К. Чорнага, нельга лічыць бездакорным. Раман «Пошукі будучыні», напрыклад, без усякіх указанняў на гэта, друкуецца са значнымі скарачэннямі, якія зніжаюць патрыятычны і гуманістычны пафас твора, ларушаюць мастацкую структуру яго тэксту. Не абыйшлося і без моўнай «праўкі», што ў адносінах да такога стыліста, як К. Чорны, здаецца больш чым дзіўным. «Папраўкі» сустракаюцца не толькі ў «Пошуках будучыні». Зусім незразумела, для чаго патрэбна было, напрыклад, замяняць у «Трэцім пакаленні» слова «горла» (выданне 1941 г.) на «глотка» ў такім сказе: «Яму здалося, што горла пачало цягнуцца ў рот. Ён душыўся».

У каментарыях да шасцітомніка К. Чорнага чамусьці не гаворыцца, адкуль перадрукоўваюцца творы. Больш таго, грубыя тэкставыя памылкі нідзе не агаворваны. Напрыклад, на старонцы 72 (т. 2) чытаем:

«Ціхая была зіма. Сляды там на снезе засталіся нядоўга» (трэба «надоўга»).

У апавяданні «Нянавісць» замест «Wesołego aleluja» — бяссэнсоўнае «Wesołego aleluja» (т. 2, стар. 135) і г.д.

Выхад у свет Збору твораў К. Чорнага—значная падзея ў культурным жыцці нашай рэспублікі.

А. АДАМОВІЧ.

Маладыя кампазітары

У класах кампазіцыі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (кіраўнікі — прафесар М. Аладаў і дацэнт А. Багатыроў) навучаецца некалькі маладых кампазітараў. Гаворачы аб найбольш творча актыўных з іх, трэба перш за ўсё назваць Я. Глебава. Пяць год назад Я. Глебаў, у мінулым чыгуначнік, паступаючы ў кансерваторыю, не меў амаль ніякіх музычных ведаў. Толькі прыродны талент і напружаная праца над сабою дапамаглі яму выдатна засвоіць шматлікія прадметы складанага навучальнага плана музычнай вышэйшай навучальнай установы. Калі знаёмішся з творамі маладога кампазітара, заўважаеш яркі і самабытны меладычны талент.

Я. Глебавым напісана паэма-легенда для сімфанічнага аркестра «Машэка» (на сюжэт паэмы Я. Купалы «Магіла льва»), аркестровае скерца «Вясенні малюнак», дзве фантазіі на беларускія народныя тэмы — для фартэпіяно з сімфанічным аркестрам і для аркестра народных інструментаў, саната для фартэпіяно, п'еса для кларнета і фартэпіяно і рад рамансаў на тэксты беларускіх паэтаў.

Свежым меладычным талентам, блізкім беларускай народна-песенной творчасці валодае і Ю. Семяняка. У яго творчасці заўважаецца прыхільнасць да вакальнай музыкі. Ён з'яўляецца аўтарам раду ўдалых масавых песень на тэксты беларускіх паэтаў. Гэтыя песні часта выконваюцца на канцэртнай эстрадзе. Ім напісана некалькі рамансаў і хораў а-капела. Нядаўна Ю. Семяняка закончыў трыё для фартэпіяно, скрыпкі і віяланчэлі, тэматыка якога таксама мае ярка выяўленую нацыянальную афарбоўку.

Сярод іншых студэнтаў трэба адзначыць Г. Анчыкава і В. Чараднічэнку. Г. Анчыкаў глыбока перадае рысы нацыянальнай своеасаблівасці ў мелодыцы сваіх твораў. У аснову напісаных ім варыяцый для фартэпіяно і санаты для скрыпкі і фартэпіяно, а таксама хораў пакладзены народныя тэмы, да распрацоўкі якіх малады кампазітар падыходзіць надзвычай чула.

В. Чараднічэнка, які валодае добрымі здольнасцямі, напісаў скерца для сімфанічнага аркестра і рамансы на тэксты сучасных паэтаў. Цяпер ён працуе над квінтэтам для фартэпіяно, двух скрыпак, альта і віяланчэлі, мелодыка якога блізкая рускай народна-песеннай творчасці.

У класе М. Аладава вучацца студэнты Р. Бутвілоўскі і А. Дудзін. Р. Бутвілоўскі больш цікавіцца інструментальнай музыкай (варыяцыі для фартэпіяно, трыё для фартэпіяно, скрыпкі і віяланчэлі, над якімі малады кампазітар працуе цяпер). Побач з гэтым Р. Бутвілоўскі напісаў масавыя песні. Ён займаецца апрацоўкай беларускіх народных песень.

А. Дудзін, маючы большую схільнасць да твораў вакальнай музыкі, напісаў некалькі рамансаў на тэксты Пушкіна, хоры а-капела. Аднак удалым яго творам трэба назваць варыяцыі на тэму народнага характару. Цяпер А. Дудзін працуе над санатай для фартэпіяно.

У набыцці тэхнічных навыкаў, у паступовым авалоданні кампазітарскім майстэрствам маладыя кампазітары, студэнты кансерваторыі стаяць на правільным шляху. У іх выхоўваецца перш за ўсё любоў і павага да таго, што павінна стаць асновай іх творчасці — да народнай песні. Але для гэтага кансерваторыя павінна арганізоўваць штогод летнія экспедыцыі студэнтаў-кампазітараў і музыказнаўцаў у розныя раёны рэспублікі для запісу народных песень, што прынесла-б вялікую карысць для маладых творцаў музыкі.

Пры вывучэнні студэнтамі-кампазітарамі рускай класічнай і зарубежнай музыкі, пры вывучэнні творчасці совецкіх кампазітараў, яны адчуваюць на сабе той ці іншы ўплыў. У гэтым не трэба бачыць нічога асабліва дрэннага — у тым выпадку, вядома, калі такія, непазбежныя пры творчым росце моладзі, уплывы не ператвараюцца ў сляпое пераймаанне.

Вучэбная праграма класа кампазіцыі дае магчымасць студэнту за гады навучання яго ў кансерваторыі атрымаць патрэбныя навыкі ў напісанні твораў музычных жанраў — камерных, сімфанічных, кантатна-аратарыяльных і оперных. Пажадана, каб оперны жанр, які застаецца вядучым у совецкім музычным мастацтве, прыцягнуў-бы ўвагу маладых кампазітараў у большай ступені, чым гэта наглядалася да гэтага часу. Гэта тым больш важна, што ва ўмовах Беларусі оперная творчасць усё яшчэ ў заняпадзе.

Вельмі важна, каб творчая праца моладзі часцей выносілася на суд нашай музычнай грамадскасці. Саюз кампазітараў БССР наладжвае прагляды новых работ маладых кампазітараў, але яны, на жаль, адбываюцца ў вельмі вузкім коле ўдзельнікаў.

У канцы мінулага навучальнага года ў адкрытым канцэрце кансерваторыі былі выкананы камерныя творы кампазітараў-студэнтаў, якія прыцягнулі ўвагу грамадскасці. У гэтым годзе, калі нашы кампазітары рыхтуюцца да свайго другога Усесаюзнага з'езду, неабходна шырэй паказаць творчыя здабыткі кампазітарскай моладзі. Вельмі пажадана было-б наладзіць паказ лепшых твораў маладых кампазітараў перад студэнцкай і рабочай аўдыторыямі — у залах буйнейшых вышэйшых навучальных устаноў і заводскіх клубаў нашай сталіцы.

Н. АРЛОЎ.

Шырока рыхтуюцца да агляду мастацкай самадзейнасці на заводзе імя Молатава. Драмгурткоўцы падрыхтавалі спектакль «У бэзавым садзе» Ц. Саладара, танцавальная група — новыя танцы.

На здымку: 1. Сцэна са спектакля «У бэзавым садзе». 2. Рабочыя **Г. Бабкоў** і **Н. Фурман** выконваюць рускую пляску.

Фота **Л. Мазалева.**

Па Гомельскай вобласці

Новыя спектаклі абласнога тэатра

Абласны драматычны тэатр пачаў асенне-зімовы сезон новымі спектаклямі па п'есах совецкіх драматургаў. Спектакль «Іван Рыбакоў» В. Гусева пастаўлены рэжысёрам С. Гурыч у мастацкім афармленні Е. Есафавай.

У галоўных ролях выступілі: заслужаны артыст Казахскай ССР І. Дуброўскі, артысты В. Стрыжоў, Г. Стэльмаховіч, Р. Барзова, Н. Забелін, А. Валодзіна.

Другая прэм'ера сезона — «Крыштальная крыніца» Е. Бондаравай (рэжысёр І. Дуброўскі, мастак Д. Рэчной).

Спектаклі маладога калектыву цёпла сустракаюць гледачы.

Да агляду самадзейных калектываў

Творчыя калектывы вобласці рыхтуюцца да Усесаюзнага агляду мастацкай самадзейнасці профсаюзаў. Новыя беларускія песні развучваюць хоры фабрык, заводаў, машынна-трактарных станцый, навучальных устаноў.

У рэпертуары лепшага жаночага хору, якім кіруе самадзейны кампазітар Г. Гапонаў (гомельская фабрыка «8-е сакавіка»), новыя песні «Едзе моладзь Беларусі», «За мір і шчасце», частушкі на вытворчыя тэмы.

Хор завода «Гомсельмаш» (кіраўнік В. Курбатава) будзе спяваць «Прывітальную Маскве» П. Шыдлоўскага і «Сабраліся хлебаробы» пачынаючага кампазітара Н. Бяспалава.

Калектыў Палаца культуры чыгуначнікаў імя Леніна (хормайстар М. Дзімант) падрыхтаваў песню «Радзіма мая дарагая» Ул. Алоўнікава, кітайскую народную песню, хор з оперы Б. Сметаны «Прададзеная нявеста».

Узбагаціўся і рэпертуар хораў Добрушскага цэлюлёзна-папяровага камбіната «Герой працы», Мазырскага гарадскога Дома культуры, Рэчыцкага мэблевага камбіната.

Перад слухачамі выступяць таксама домравы ансамбль Палаца культуры імя В. І. Леніна, домрава-балалаечны калектыў Рагачоўскага Дома культуры, Васілевіцкі і Добрушскі духавыя аркестры.

У аглядзе прымуць удзел танцавальныя групы Уваравіцкага і Ельскага раённых Дамоў культуры, Мазырскі і Рэчыцкі гарадскія калектывы. У іх рэпертуары — мантаж «Як той Зосі давялося», «Лявоніха», «Волжская кадрыль», танец маленькіх лебедзяў з балету «Лебядзінае возера».

Драматычныя гурткі падрыхтавалі ластаноўкі «Пяюць жаваранкі», «Выбачайце, калі ласка!» і вечар класічных вадэвіляў. Чытальнікі рыхтуюцца дэкламаваць новыя творы беларускіх паэтаў.

Канцэрты артыстаў Белдзяржфілармоніі

У Палацы культуры імя Леніна і ў раёнах вобласці выступае канцэртная група артыстаў Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

У складзе групы — спевакі, артысты балету, майстры мастацкага слова і інш.

Рэпертуар брыгады складаецца з песень кампазітараў Хачатурана, Фельцмана, Табачнікава, твораў совецкіх пісьменнікаў.

Выконваюцца таксама ўрыўкі з аперэт і песні румынскіх, чэшскіх, французскіх і італьянскіх кампазітараў.

У музычным вучылішчы

Будучыя вакалісты, піяністы, выканаўцы на народных інструментах, скрыпачы і дырыжоры-харавікі навучаюцца ў Гомельскім музычным вучылішчы. Выпускнікі гэтага года працуюць мастацкімі кіраўнікамі раённых дамоў культуры, выкладчыкамі музычных школ, хормайстрамі ў самадзейных калектывах.

Найбольш здольныя выхаванцы вучылішча — спявак М. Пушкароў, віяланчэліст С. Мадорскі, дырыжоры-харавікі Е. Грамыка і А. Мурашка прадаўжаюць сваю адукацыю ў Мінскай кансерваторыі.

У бягучым навучальным годзе прынята 85 новых слухачоў. Сярод новага набору — спевакі В. Раговіч (Парычы) і А. Ермоленка (Палац культуры імя Леніна), музыканты А. Цітова, А. Гарбатоўскі і іншыя.

Калектыў выкладчыкаў папоўніўся спецыялістамі па баяну, па народных інструментах, фартэпіяно. З новага навучальнага года выкладаецца клубная справа для будучых мастацкіх кіраўнікоў сельскіх дамоў культуры.

Больш мільёна гледачоў

На працягу лета звыш мільёна вясковага насельніцтва вобласці прагледзела новыя мастацкія, дакументальныя і сельскагаспадарчыя фільмы. Найбольш арганізавана працуюць кінаперасоўкі Гомельскага, Калінкавіцкага і Рагачоўскага раёнаў. Кіномеханікі гэтых раёнаў П. Галамысаў, Ф. Трошка, Н. Клімовіч і іншыя наладжваюць перад сеансамі гутаркі агранамаў, зоатэхнікаў і настаўнікаў, арганізуюць светавыя газеты на мясцовым матэрыяле, шырока рэкламуюць сярод насельніцтва новыя фільмы.

Гомель. **(Наш кар.).**

Свята песні ў Пружанах

На стадыёне ў Пружанах адбылося традыцыйнае свята песні. Яно адкрылася выступленнем зводнага хору. Быў выканан Дзяржаўны Гімн Беларускай ССР. Паказалі сваё майстэрства струнны аркестр і танцавальная група самадзейнага калектыву дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка.

Цёпла сустрэлі прысутныя калектыў самадзейнасці дзіцячага дома. Выступалі таксама калектывы мастацкай самадзейнасці Падкрайчаўскай і Дубачанскай хатчыталень, райпромкамбіната і іншыя.

І. ХАЗАН,
Р. НАЙДОВІЧ.

З ЗАМЕЖНАЙ ПОШТЫ

„Негрыцянская Пампея"

Яшчэ каля 25 год таму назад вядомы англійскі археолаг Фрэнц Чаўль, які падарожнічаў тады па поўднёва-заходняй Сахары, выказаў здагадку, што тут пад вялікімі пясчанымі ўзгоркамі пахаваны рэшткі старажытных гарадоў. Некалькі пазней французскі вучоны Эміль Гацье надрукаваў серыю артыкулаў, у якіх ён даказваў, што ў Афрыцы, у другім тысячагоддзі да нашай эры, была высокая негрыцянская культура і асобныя помнікі яе, відаць, захаваліся і могуць быць знойдзены.

У гутарцы з супрацоўнікамі газет Эміль Гацье паведаміў, што рэчаіснасць перавысіла яго самыя смелыя здагадкі.

Археалагічныя раскопкі ў поўднёва-заходняй частцы пустыні Сахары (каля аула Гейджа) праводзяцца ўжо некалькі год. У іх удзельнічаюць англійскія, французскія і галандскія вучоныя. У гэтым годзе знойдзены вялікія крэпасныя сцены і падземныя галерэі, дзе захаваліся прадметы культу і рад твораў мастацтва. Раскопкі сведчаць аб высокай культуры негрыцянскіх плямён таго часу. Англійскі археолаг Эванс лічыць, што мы маем справу з культурай, якая адпавядае эпосе старажытнейшай крыто-мекенскай культуры Грэцыі і грэчаскіх астравоў. Акрамя твораў мастацтва і прадметаў культу, тут знойдзены рад матэрыялаў, якія сведчаць аб параўнальна высокай тэхніцы негрыцянскіх пасяленняў той эпохі. У падземных галерэях захаваліся досыць дасканалыя ганчарныя вырабы і металічная зброя. Вучоныя, якія праводзяць раскопкі, лічаць, што гэта — старажытная культура неграў-банту. 1500—2000 год да нашай эры ў гэтым раёне Сахары не было яшчэ пяскоў, а пазней прыродныя ўмовы прымусілі негрыцянскія плямёны перайсці на поўдзень.

Асабліва вялікае ўражанне стварае падземная галерэя, дзе знойдзены насценны жывапіс, а таксама некалькі старажытных магільных склепаў, у якіх добра захаваліся мумії і прадметы культу. Узоры насценнага жывапісу не раз апублікоўваліся ў еўрапейскай прэсе. Яны сведчаць аб даволі высокай мастацкай культуры негрыцянскіх пасяленняў той эпохі. Да цікавых вывадаў прыйшоў англійскі археолаг Давідсан. Ён лічыць, што гэтая старажытная культура неграў уплывала ў далейшым на развіццё егіпецкай культуры. На яго думку, у Афрыцы, у тыя далёкія часы, знаходзіўся адзін з важнейшых цэнтраў чалавечай культуры.

Пры адкрыцці адной з грабніц знойдзены старажытныя пісьмёны. Яны яшчэ не расшыфраваныя. Для расшыфроўкі іх запрошаны выдатныя індыйскія і чэхаславацкія вучоныя.

Індыйскі вучоны Чарду (знаўца старажытных рукапісаў) заявіў, што ў старажытных індыйскіх рукапісах ёсць звесткі аб вялікіх квітнеючых, пазней зруйнаваных негрыцянскіх гарадах, якія існавалі некалі ў Афрыцы.

У сувязі з гэтымі раскопкамі, якія французскія журналісты называюць «Негрыцянскай Пампеяй» (назва, вядома, недакладная, бо культура Пампеі адносіцца да значна больш позняга часу), многія англійскія і французскія вучоныя па-новаму ставяць пытанне аб значэнні культуры афрыканскіх неграў у агульным культурным развіцці чалавецтва. Справа ў тым, што адначасова праводзяцца раскопкі ў Бельгійскім Конго, дзе знойдзены руіны старажытнага негрыцянскага горада, якія адносяцца да яшчэ больш позняй эпохі, прыкладна да X—XII стагоддзяў нашай эры, і таксама сведчаць аб вельмі высокай культуры негрыцянскіх плямён ужо другога раёна Афрыкі. Рад цікавых раскопак праведзены таксама ў Радэзіі.

Партугальскі вучоны Перэйро знайшоў у архівах горада Каімбра рад рукапісаў, якія адносяцца да XV-XVI стагоддзяў. Гэта — невядомыя запіскі першых партугальскіх заваёўнікаў Афрыкі, якія расказваюць аб параўнальна высокай культуры негрыцянскіх плямён і аб разбурэнні еўрапейцамі вялікіх негрыцянскіх крэпасцей і гарадоў.

Новыя археалагічныя раскопкі выклікалі вялікую цікавасць да старой негрыцянскай культуры. У французскім прагрэсіўным часопісе «Пансе» гаворыцца, што, можа быць, у выказваннях асобных археолагаў і гісторыкаў ёсць пэўныя элементы перабольшання, але, бясспрэчна, апошнія даследванні археалагічнай навукі сведчаць аб высокай культуры карэннага насельніцтва Афрыкі як у даўні час, так і ў больш блізкую нам эпоху.

Гэтая культура разбуралася па меры пранікнення еўрапейскіх заваёўнікаў, у выніку чаго негрыцянскія плямёны спыніліся ў сваім развіцці. Але ва ўсякім выпадку, піша часопіс, новыя археалагічныя знаходкі наносяць новы моцны ўдар па праслаўтай расавай тэорыі і паказваюць, што ўсе народы ўдзельнічалі ў стварэнні агульначалавечай культуры.

І. БАРЫСАЎ.

З РЭДАКЦЫЙНАЙ ПОШТЫ

Са спазненнем на поўгода

Кожны тыдзень у Талачынскім раённым Доме культуры дэманструюцца дваты новыя мастацкія фільмы. Як заўсёды, перад пачаткам паказу фільма на экране глядач бачыць кіночасопіс «Навіны дня».

Але талачынцам не шанцуе. Чамусьці абласная кантора кінапраката дасылае ў раён новыя фільмы і... старыя «Навіны дня». Нязвыкла гучаць гэтыя словы ў такім спалучэнні. Летам, напрыклад, жыхарам раённага цэнтра паказвалі лыжныя спаборніцтвы, а зімой хроніку аб пачатку палявых работ і г. д.

Нярэдка здараецца, што «Навіны дня» паказваюцца гледачу са спазненнем на пяць месяцаў, а то і на поўгода. Аб карысці такіх «навін» гаварыць не прыходзіцца.

С. ТАЛАЧЫНСКІ.

Забылі да нас дарогу

Калектыў мастацкай самадзейнасці Сычоўскага сельскага клуба Нясвіжскага раёна быў адным з перадавых у рабоце. Але цяпер ён ніякай работы не праводзіць, бо няма кіраўніка.

Раней да нас для арганізацыі работы прыязджаў дырэктар Нясвіжскага раённага Дома культуры т. Кіеня. Прыязджалі і мастацкія кіраўнікі т.т. Садоўскі і Мельнікава. Цяпер-жа і яны забылі да нас дарогу.

Неўзабаве адбудзецца раённы агляд мастацкай самадзейнасці. Трэба, каб наш калектыў быў узорна падрыхтаваным да гэтай падзеі.

С. ФЯНЬКО,
удзельнік калектыву мастацкай самадзейнасці.

ПІСЬМЫ З ВОБЛАСЦІ

Інспектар прыехаў

Мы пазнаёміліся з Антанінай Нікадзімаўнай Патапенка — інспектарам Віцебскага абласнога ўпраўлення культуры ў гасцініцы Полацкага горкомунгаса. Звычайна яна ўставала рана, спяшаючыся, перагортвала блакнот з запісамі і незадаволена ўздыхала. Нейкі момант яна маўчала, а пасля нечакана пачала гаворку.

— Вестка аб тым, што ўсе інспектары нашага ўпраўлення ў тэрміновым парадку павінны паехаць у камандзіроўкі, узрадавала ўсіх нас, — расказвала яна. — Даўно пара было гэта зрабіць, а то засядзеліся мы ў сваіх кабінетах. Часам думаеш: хто ты — інспектар або архіварыус. І ведаеце, — хвалюючыся, гаворыць Антаніна Нікадзімаўна, — гэтае пытанне непакоіць не толькі мяне, а і маіх таварышаў па рабоце.

— Што-ж так моцна хвалюе вас, мы-ж сустраліся з вамі не ў абласным упраўленні культуры, а ў Полацку?

Антаніна Нікадзімаўна разгубілася, пачырванела, але хутка з прысутным маладосці запалам пачала расказваць:

— Толькі шчаслівы выпадак дапамог нам, нарэшце, пакінуць упраўленне.

— Вы гаворыце загадкамі, што гэта за шчаслівы выпадак?

— Хутка адбудзецца сесія абласнога Совета дэпутатаў працоўных, — тлумачыла яна.—Мяркуецца, што на сесіі з дакладам аб рабоце культасветустаноў вобласці выступіць намеснік старшыні аблвыканкома тав. Хацько. Дык вось, каб сабраць матэрыял для дакладчыка, і паслалі ўсіх нас у камандзіроўкі.

— Гэта-ж добра, што ў раёны выехала столькі людзей...

— Добра, але не вельмі, — ужо злуючыся гаворыць інспектар. — Пазнаёмцеся, калі ласка, з гэтымі паперамі і вы зразумееце, у чым справа.

Гэта была «Схема асноўных пытанняў, на якія рэкамендуецца звярнуць асаблівую ўвагу пры праверцы работы культурна-асветных устаноў у гарадах і раёнах Віцебскай вобласці». Ужо адна назва гэтага памятнага дакумента насцярожвае.

Толькі з горкай іроніяй можна было назваць гэты дапаможнік «схемай» — у ім восем раздзелаў, нібы ў сапраўднай навуковай працы. Кожны раздзел падзяляецца на пытанні — іх аж 35! Вось для прыкладу некаторыя з іх: «Прывесці дадзеныя размяшчэння культурна-асветных устаноў, санітарна-тэхнічны стан памяшканняў, асобна коратка ахарактарызаваць (?) кожную ўстанову, асобна і каму належыць памяшканне, ведамственае арандуемае за кошт другога ведамства, прыватнае. Прывесці дадзеныя ў разрэзе (?) кожнай установы, забяспечанасць гаспадарчым і спецыяльным інвентаром, як падрыхтаваны да зімы і выкарыстаны асігнаванні на рамонт і набыццё інвентару за 1954 і 1955 год».

Не будзем спыняцца на стылі «схемы», няхай гэта застанецца на сумленні яе складальнікаў. Справа, зрэшты, не ў гэтым. Звернем увагу на галоўнае. Была задумана сапраўды добрая справа: праверыць работу культасветустаноў вобласці. Але добрая задума яшчэ ў зародку загінула.

На самай справе, што значыць зрабіць «аналіз лекцыйнай работы ў раёне», «пазнаёміцца з самадзейнай народнай творчасцю», «паказаць добрых кінаработнікаў і прычыны іх дрэннай (?) работы». Можна, вядома, грунтоўна вывучыць кожнае такое пытанне, але для гэтага неабходна не проста наведаць хаты-чытальні або бібліятэкі, але і пабыць у кожнай некалькі дзён, паездзіць разам з кіномеханікам па яго маршруту, пагутарыць з гледачамі і г. д. Такога часу ніхто з камандзіраваных не меў. Іх усіх паслалі ў раёны на шэсць дзён і патрабавалі за гэты час даць адказы на ўсе 35 пытанняў, якія былі запісаны ў «схеме».

— Як магло здарыцца, што ўсе камандзіраваныя ў дапамогу атрымалі такую «схему»? — спыталі мы ў начальніка абласнога ўпраўлення М. Жылінскай.

— А што я магла зрабіць? Намеснік старшыні аблвыканкома тав. Хацько ўзяўся рыхтаваць даклад, ён і прапанаваў звярнуць увагу на гэтыя пытанні.

— Чаму-ж вы не пераканалі тав. Хацько, што мала карысці прынясе такая праверка?

— Вы патрабуеце немагчымага, — адказала тав. Жылінская.—Толькі падумайце: работу культасветустаноў будзе абмяркоўваць сесія абласнога Совета дэпутатаў працоўных. Калі гэта ў нас бывае? А я тут буду даваць свае ўказанні,— і, крыху падумаўшы, яна дадала:—Зрэшты для даклада можна знайсці дастаткова фактаў нават і з такіх камандзіровак.

Сапраўды, на сесіі пастаўлена важнае пытанне. Але пры яго падрыхтоўцы забыта асноўнае: жывая работа культасветустаноў, іх патрэбы, умовы працы.

І вось інспектар А. Патапенка ў час камандзіроўкі ў Полацк вымушана старанна займацца зборам розных звестак. Наколькі адной зрабіць гэта цяжка, у дапамогу быў мабілізаваны ўвесь апарат аддзела культуры — загадчык, інспектары і нават бухгалтар. Практычна такая, з дазволу сказаць, «праверка» выглядала так: на працягу пяці дзён усе гэтыя работнікі разам з інспектарам збіралі лічбы і факты, званілі па тэлефону ў розныя арганізацыі. Ды інакш нельга было: у Полацкім раёне 32 культасветустановы, з іх 29 сельскіх.

Працоўны дзень у інспектара Патапенка звычайна пачынаўся так.

— Вы званілі ў райфо, — пыталася яна ў загадчыка раённага аддзела культуры тав. Гурчонка. — Мне-ж патрэбны звесткі па самаабкладанню.

— Не званіў яшчэ, — спакойна адказвае Пётр Іванавіч.

— А звесткі па кадрах гатовы?—пытае яна ў інспектара аддзела тав. Панкрацьева.

— Так хутка вы хочаце іх атрымаць. Бачыце колькі ў мяне «асабістых» спраў, усе іх трэба перачытаць...

— Што-ж мне рабіць? — гаварыла яна. — А мне-ж яшчэ патрэбны звесткі па кіно, мастацкай самадзейнасці, аб падрыхтоўцы культасветустаноў да зімы, дадзеныя аб прачытаных лекцыях і выкарыстанні бюджэтных сродкаў...

— Не пройдзе і тыдня, як мы вам усе іх пакладзем на стол, — жартуючы гаворыць інспектар аддзела В. Карчомкін.

Але А. Патапенка было не да жартаў. Ёй абавязкова трэба было пад'ехаць у Палатоўскі сельскі клуб. Магчыма яна гэтага і не зрабіла-б, але з абласной газеты на рэагаванне прыслалі пісьмо, у якім рабочыя соўгаса «Палата» скардзіліся на дрэнную работу бібліятэкі клуба.

І вось мы ў Палатоўскім сельскім клубе. Знаёмімся са станам спраў на месцы. Заходзім у памяшканне. На чорных сценах расклеены так-сяк напісаныя на шпалерах лозунгі. Ішоў дождж, і папера зацякла, у многіх месцах фарба разлілася і цяжка было прачытаць, што там напісана.

У клубе холадна і няўтульна, падлога брудная, у зале дзесяткі два неабгабляваных лавак, на якія небяспечна садзіцца ў добрым касцюме ці сукенцы. Ёсць у клубе два дзесяткі крэслаў, але і яны маюць такі-ж непрывабны выгляд. Алізны стол засланы шматком старога чырвонага паркалю...

Ну хто, скажыце, пойдзе сюды вечарамі? Хіба толькі зацятыя більярдысты (у клубе стаіць вялікі більярд і займае ледзь не палову залы). Раней вечарамі збіраліся сюды рабочыя соўгаса «Палата» паспяваць ды патанцаваць, быў гармонік, але ён сапсаваўся, і клуб перасталі наведваць. У двух шафах захоўваюцца кнігі. Праўда, новых вельмі мала, бо за дзевяць месяцаў не было набыта ніводнай кнігі. Чытачоў у бібліятэцы 116 чалавек, з іх больш палавіны — вучні. Даўно не збіраўся совет клуба. Слаба дапамагае ў рабоце і аб'еднанне лектараў. А што можа зрабіць загадчык клуба Сямён Іосіфавіч Гайдукоў? Цяжка яму аднаму.

— Проста рукі апускаюцца, калі бачыш перад сабою сцяну, якую нічым не праб'еш, — скардзіўся ён. — Ніхто не цікавіцца работай клуба: ні ў соўгасе, ні ў раёне, — і ўжо з радасцю дадае: — Добра, што хоць вы прыехалі, дапаможаце мне. — І не тоячыся, расказвае пра ўсе недахопы і цяжкасці ў рабоце.

Антаніна Нікадзімаўна пачырванела, захвалявалася і слова не магла сказаць. Ды і што сказаць гэтаму чалавеку, бо і яна, работнік з вобласці, праз якія дзве гадзіны паедзе адсюль — інакш не паспее сабраць у тэрмін усе звесткі.

Пасля доўгіх хістанняў А. Патапенка папрасіла прабачэння і абяцала ў бліжэйшы час прыехаць зноў ужо на некалькі дзён. На хаду інспектар растлумачыла, як складаць план работы, што неабходна зрабіць у бліжэйшыя дні і... пайшла з такім пачуццём, нібы пакінула чалавека ў бядзе.

Яе хвалявала пытанне: калі ўжо інспектары абласнога ўпраўлення культуры будуць займацца сваімі непасрэднымі абавязкамі, калі яны будуць самастойна вырашаць тыя ці іншыя пытанні работы культасветустаноў? Існуючая-ж практыка ператварыла інспектара ў зборшчыка ўсялякіх звестак.

Трэба сказаць, што наогул інспектары ўпраўлення выязджаюць у раёны вельмі і вельмі рэдка. Вопытны інспектар Васіль Гаўрылавіч Цімошчанка за 9 месяцаў 1955 года ў камандзіроўках быў 38 дзён, з іх дзесяць—у Мінску на рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці, сем дзён працаваў па заданню ў калгасе і толькі 21 дзень займаўся непасрэдна сваёй работай. Вядома, гэтага мала. Запомнілася В. Цімошчанку толькі адна камандзіроўка, калі ён быў у красавіку ў Талачынскім раёне. Пасля гэтага ў друку з'явіліся абавязацельствы калгаснікаў сельгасарцелей «Большэвік» і «Праўда», якія сваімі сіламі рашылі добраўпарадкаваць культасветустановы. Астатнія выезды ў раёны не прынеслі інспектару ніякага задавальнення. У Багушэўскім раёне ён займаўся падрыхтоўкай да абласной нарады работнікаў культуры, а ў Сенненскім, як і цяпер у Лепельскім — праверкай работы.

Інспектар А. Патапенка за дзевяць месяцаў была ў камандзіроўках 26 дзён, інспектар Марозава — 25. Характэрна, што ў самы гарачы час летніх палявых работ, калі ўсе культасветустановы павінны былі працаваць асабліва аператыўна, інспектары сядзелі ва ўпраўленні.

Ёсць вялікая неабходнасць, каб інспектары часцей наведвалі сельскія клубы, хаты-чытальні, бібліятэкі. Дрэнна працуюць культасветустановы самага далёкага ад Віцебска Ушацкага раёна. Ніхто з кіраўнікоў упраўлення за дзевяць месяцаў чі разу не быў у гэтым раёне. Затое пад неаслабнай увагай упраўлення знаходзяцца бліжэйшыя раёны—Багушэўск, Орша, Бешанковічы і іншыя, куды лягчэй даехаць і адкуль можна хутчэй вярнуцца.

Адсутнасць кантролю за работай многіх раённых аддзелаў культуры прыводзіць часам да анекдатычных фактаў. У Лепельскім раёне, напрыклад, загадчык Несенскага сельскага клуба Анна Плют на верасень планавала праводзіць гутаркі аб «Выніках веснавой сяўбы, доглядзе за пасевамі і аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю...»

Абавязак інспектара абласнога ўпраўлення культуры — сістэматычна кантраляваць работу раённых аддзелаў культуры, сельскіх клубаў і бібліятэк. У інтарэсах справы неабходна разгрузіць іх ад канцылярскай работы, якою яны празмерна загружаны. Інспектар абавязаны дзве трэці свайго часу праводзіць непасрэдна ва ўстановах культуры.

У жывым аператыўным кіраўніцтве маюць сёння вялікую патрэбу ўсе культасветустановы рэспублікі.

Я. ДАНСКАЯ.

Па слядах неапублікаваных матэрыялаў

Чытач нашай газеты тав. Хурсан пісаў у рэдакцыю аб дрэнным культурна-бытавым абслугоўванні працоўных горада Маладзечна. У адказ на гэты допіс намеснік старшыні Маладзечанскага горсовета Н. Дзіеў паведаміў, што гэтае пытанне нядаўна было абмеркавана на сесіі гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. Прыняты меры да паляпшэння культурна-бытавога абслугоўвання жыхароў горада.

* * *

Загадчык аддзела партыйных органаў Гомельскага абкома партыі тав. Івалгін, якому пасылалася на рэагаванне пісьмо чытача тав. Чыкуна аб благіх паводзінах загадчыка Журавіцкага Дома культуры тав. Кавалёвай, паведаміў рэдакцыі, што бюро Журавіцкага райкома партыі за амаральныя ўчынкі вынесла тав. Кавалёвай суровае партыйнае спагнанне. Кавалёва знята з пасады загадчыка раённага Дома культуры.

* * *

Начальнік пасажырскай службы Беларускай чыгункі тав. Якаўлеў прыслаў адказ на пісьмо нашага чытача тав. Абадэнкі аб нездавальняючай рабоце станцыі Мінск-пасажырская. Гэтае пытанне было разгледжана пасажырскай службай Беларускай чыгункі.

Начальніку вакзала тав. Фёдараву прапанавана забяспечыць строгае выкананне правіл перавозак пасажыраў, а таксама правесці растлумачальную работу сярод работнікаў вакзала, каб узняць культуру абслугоўвання пасажыраў.

* * *

Чытачы нашай газеты неаднаразова пісалі ў рэдакцыю аб неабходнасці адкрыць у Маладзечанскай вобласці некалькі краязнаўчых музеяў. Іх пісьмы пасылаліся на рэагаванне.

Начальнік абласнога ўпраўлення культуры С. Пронька паведаміў, што ў бліжэйшы час прадугледжваецца адкрыццё двух музеяў — раённага краязнаўчага ў горадзе Ашмяны і абласнога краязнаўчага — у Маладзечна. У Ашмянах будынак для музея пабудаваны ўжо і музей працуе.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Дзмітрый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Барыс ПЯРКОЎСКІ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 03402 Друкарня імя Сталіна.